штотыднёвая грамадска-асветніцкая газета
KIMPRESS.BY

КУЛЬТУРА

13 жніўня 2022 г.
№33 (1576)

Даступнае жыллё, кірмашы і танцы для пенсіянераў. Што хвалюе насельніцтва ў сферы культуры 4

Пра яго ведаюць лічаныя адзінкі. Зігзагі жыцця выдатнага беларускага творцы 15

Адчуць сябе ёгам і ўбачыць вымерлую сараканожку. Прывазныя выставы супраць класічнага мастацтва: хто пераможа? 6

Лёс класіка мог скласціся інакш? Гісторыя аднаго экспаната 13

Азарэнне прыйшло ў сне. Казка даўжынёй у 35 гадоў 14

Ніякіх скаргаў і апеляцый. Вынікі прыёму ў БДАМ 5

Рок-музыканты — па паратунак і бласлаўленне, гледачы — па цуд 8

Мы разам — за Беларусь

Форум патрыятычных сіл сабраў 9 жніўня ў сталіцы прадстаўнікоў вядучых грамадскіх арганізацый і палітычных партый краіны. "Белая Русь", Беларускі саюз жанчын, БРСМ, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі... У будынку Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ўзгадвалі падзеі двухгадовай даўніны і зробленыя высновы. Гаварылі пра новы падыход да патрыятычнага выхавання і важнасць захавання гістарычнай памяці, пра захоўванне помнікаў і мемарыялаў. Абмяркоўвалі пытанні далейшага развіцця грамадзянскай супольнасці, удасканалення партыйнай сістэмы, прасоўвання грамадскіх ініцыятыў.

Форум патрыятычных сіл заклікаў беларусаў згуртавацца. Пасля падпісання дэкларацыі ўдзельнікі мерапрыемства далучыліся да шматлікіх аднадумцаў, якія сабраліся ў Аляксандраўскім скверы, дзе распачалася канцэртная праграма "Любимую не отдают". Сваімі выступленнямі мінчан і гасцей сталіцы парадавалі папулярныя гурты "Aura" і "Беларусы", знакамітыя выканаўцы Юлія Быкава, Ірына Дарафеева, Вікторыя Алешка, Жанэт, іншыя зоркі беларускай эстрады. Завяршыўся вечар аўтапрабегам — калона аўтамабіляў з дзяржаўнай сімволікай праехала па Мінску.

9 771994 478007 22033

У нумар

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што па выніках года Беларусь можа спрацаваць не горш за папярэдні

У рамках правядзення пасяджэння Савета Міністраў Прэзідэнт падкрэсліў: "Хацелася б, каб па выніках гэтага года ў нас была добрая размова, мы паціскалі адзін аднаму рукі і радаваліся таму, што адносна невялікая краіна па суседствах маштабах, сярэднеэўрапейская памеру, вытрымала беспрэцэдэнтны, жудасны, нічым не абгрунтаваны націск". Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што перад урадам стаіць задача спрацаваць не горш за мінулы год. "А ці зможам мы спрацаваць на ўзроўні мінулага года? Усё ж такі санкцыі беспрэцэдэнтныя для нашай экспартна арыентаванай эканомікі. Бываючы на месцах і вывучаючы тыя ці іншыя праблемы, я пераканаўся: мы можам гэта зрабіць. Той, хто напружваецца, той і сёння працуе нядрэнна. А той, хто апусціў рукі, думаючы аб тым, што само сабой наладзіцца, ды нічога страшнага, дарыцца, — так не будзе, — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы. — Празмернае напружанне, пошук новых лагістычных ланцужкоў, новых спажыўцоў нашых тавараў і гэтак далей — пытанне нумар адзін".

***

З фонду Прэзідэнта па падтрымцы культуры і мастацтва выдзелена 3 млн рублёў на правядзенне рэстаўрацыйных і адналўленчых работ на аб'ектах са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці.

Дзякуючы гэтаму будзе рэалізаваны праект па рамонце даху і фасадаў царквы Раства Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Мураванка Шчучынскага раёна, што дазволіць захаваць унікальны помнік архітэктуры сусветнага значэння і падрыхтаваць яго да святкавання 500-гадовага юбілею.

Таксама будуць завершаны рэстаўрацыйныя работы ў сядзібна-паркавым ансамблі ў аграгарадку Залессе Смаргонская раёна і на паўночна-ўсходняй аркадзе палацавага комплексу ў гарадскім пасёлку Ружаны Пружанскага раёна.

Акрамя таго адбудзецца кансервацыя з элементамі рэстаўрацыі ў сядзібна-паркавым ансамблі ў вёсцы Закозель Драгічынскага раёна; будуць праведзены супрацьаварыйныя работы ў паўночна-ўсходнім корпусе замка Сапегаў у аграгарадку Гальшаны Ашмянскага раёна.

***

Намеснік міністра інфармацыі Ігар Бузоўскі падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай XXIX Дню пісьменства, паведаміў пра ход падрыхтоўкі да падзеі, якая адбудзецца ў Добрушы 3-4 верасня.

Стрыжневая тэма ўсіх мерапрыемстваў — Год гістарычнай памяці. Ігар Бузоўскі адзначыў, што таксама будзе раскрыта тэма гісторыка-культурнай і духоўнай спадчыны Добрушскага раёна, юбілеяў класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы, Якуба Коласа і Максіма Багдановіча. Традыцыйна пройдуць рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя "Дарога да Святыняў", узнагароджанне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу "Нацыянальная літаратурная прэмія", Фестываль кнігі і прэсы, конкурс юных чытальнікаў "Жывая класіка".

***

Прадстаўнікі вядучых грамадскіх аб'яднанняў выступілі на прэс-канферэнцыі "Моладзь — рухавік прагрэсу. Падтрымка інавацыйных праектаў".

Удзельнікі падзяліліся сваім бачаннем найбольш эфектыўнага ўзаемадзеяння з моладдзю. У прыватнасці, размова ішла пра тое, якія праекты знаходзяцца ў распрацоўцы і пра ўжо дзейныя. Таксама былі ўзнятыя пытанні перспектывы далейшага ўзаемадзеяння з моладдзю і бягучых поспехаў на розных конкурсах.

Кліч Палесся

VII Міжнародны фестываль этнакультурных традыцый "Кліч Палесся" пройдзе 20 жніўня ў а.г. Ляскавічы Петрыкаўскага раёна.

У Год гістарычнай памяці арганізатары ставяць мэту захаваць спадчыну Палесся ва ўсёй яе першаднасці і шматгранасці. Традыцыйна ў фестывальных мерапрыемствах прымуць удзел творчыя калектывы, майстры і рамеснікі з Прыпяцкага Палесся.

Арганізатарамі фестывалю выступаюць Міністэрства культуры, Гомельскі і Брэсцкі аблвыканкамы і Нацыянальны парк "Прыпяцкі".

Падрабязнасці — на сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Аб перспектывах кінематаграфіі

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 9 жніўня. Дзякуючы сродкам відэасувязі ўдзел у нарадзе прынялі таксама начальнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў.

У адпаведнасці з даручэннем Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Рамана Галоўчанкі і рашэннем Савета па развіцці кінематаграфіі, творчай групай па стварэнні фільма "Мы адзіныя" дапрацаваны рэжысёрскі сцэнарый, зроблена замена акцёрскага складу, выбраны аб'екты для здымак. Пастановачны праект і дапрацаваны рэжысёрскі сцэнарый былі абмеркаваныя 10 жніўня на пасяджэнні Савета па развіцці кінематаграфіі.

Міністэрствам культуры таксама быў абвешчаны паўторны конкурс на аказанне паслуг па вытворчасці фільма "Чорны замак Альшанскі" паводле рамана Уладзіміра Караткевіча, у выніку былі атрыманыя тры прапановы, якія будуць разгледжаныя да 20 жніўня, пераможцу вызначыць камісія па дзяржзакупках сумесна з Саветам па развіцці кінематаграфіі.

Пытанні агульнай культурнай прасторы

12 жніўня ў Мемарыяльным комплексе "Брэсцкая крэпасць-герой" Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Міністэрствам культуры Расійскай Федэрацыі быў праведзены форум "Культурная прастора Расіі і Беларусі як аснова ідэалогіі Саюзнай дзяржавы".

У рамках форума прайшоў круглы стол, асноўнымі тэмамі якога былі важнасць умацавання міжрэгіянальных культурных сувязей для фарміравання адзінай гуманітарнай прасторы дзвюх краін, культурна-гуманітарныя праекты як злучальнае звяно духоўнага жыцця народаў Расіі і Беларусі, абарона нацыянальных каштоўнасцей матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны народаў Саюзнай дзяржавы на сучасным этапе.

Таксама былі разгледжаныя такія аспекты, як грамадзянска-патрыятычнае выхаванне моладзі, захаванне агульнай гістарычнай памяці і традыцый, супрацьдзеянне фальсіфікацыі гісторыі, рэабілітацыі ідэй нацызму ды фашызму і перагляду вынікаў Другой сусветнай вайны, адзіная культурная прастора Расіі і Беларусі як фактар росту якасці жыцця, гарманізацыі грамадскіх адносін і залог дынамічнага сацыяльна-эканамічнага развіцця (у тым ліку ў кантэксце ЕАЭС), актуальнасць распрацоўкі праграмных дакументаў у мэтах фарміравання новай стратэгіі культурнага супрацоўніцтва Саюзнай дзяржавы.

Акрамя таго, у рамках форума ў выставачнай зале "Музей вайны — тэрыторыя міру" адбылося адкрыццё часовай экспазіцыі "Смаленская крэпасць у артэфактах бібліятэк і архіваў Саюзнай дзяржавы" і падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным музеем "Смаленская крэпасць" і Мемарыяльным комплексам "Брэсцкая крэпасць-герой", а таксама Беларускім дзяржаўным архівам навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Новыя магчымасці для маладых

Міністэрства культуры сумесна з кінастудыяй "Беларусьфільм" працягвае пашыраць межы беларускага кіно для моладзі і абвясціла пра пачатак двух конкурсаў для кінадзеячаў-пачаткоўцаў.

Першы конкурс сінопсісаў фільма па тэме "Легенды беларускага спорту" прысвечаны легендарнаму беларускаму спартсмену мінскага футбольнага клуба "Дынама" Аляксандру Пракапенку.

У дадзеным праекце не будзе жанравых абмежаванняў. Карціна павінна расказаць пра ролю футбаліста ў гісторыі беларускага спорту. Не выключана, што кінастужка па сімвал тагачаснай моладзі зможа натхніць сучасных юных заўзятараў футбола пачаць прафесійную спартыўную кар'еру.

Пераможца конкурсу атрымае грашовую прэмію ў памеры ста базавых велічынь і магчымасць заключыць дагавор з кінастудыяй "Беларусьфільм" на стварэнне літаратурнага сцэнарыя па сінопсісе. Заявы для ўдзелу будуць прымацца ў перыяд з 5 жніўня па 31 кастрычніка гэтага года.

Наступны конкурс, арганізаваны Міністэрствам культуры, прапануе ўдзельнікам стварыць рэжысёрскія эксплікацыі кароткаметражных студэнцкіх фільмаў. Ён будзе праходзіць у перыяд з 8 жніўня 2022 года па 23 лістапада 2023 года.

Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі (уключаючы выпускнікоў), магістранты, якія з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, што ўвесь час жывуць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Конкурс з'яўляецца адкрытым і праводзіцца ў тры этапы па наступных намінацыях: кароткаметражны фільм у негульнявой форме па тэме "Мой родны кут" (гісторыя малых гарадоў, вёсак, раённых цэнтраў Беларусі), кароткаметражны фільм у гульнявой форме па тэме "Першае каханне", кароткаметражны фільм у гульнявой форме па тэме "Гарадскія легенды" (камедыя, містыка, фальклор). Умовы конкурсу дазваляюць удзельнікам максімальна скарыстаць свой творчы патэнцыял.

Спаборніцтва паміж маладымі аўтарамі пройдзе ў тры этапы. Першы этап прадугледжвае адбор творчых канцэпцый у форме вочнай абароны праектаў у межах XXIX Мінскага Міжнароднага кінафестывалю "Лістапад" у гэтым годзе. На наступным этапе будзе адбывацца адбор арганізацый кінематаграфіі, якія прапануюць найболей прымальныя ўмовы для вытворчасці кароткаметражных студэнцкіх фільмаў. Гэта стадыя таксама ўключае здымкі кароткаметражных студэнцкіх фільмаў. Трэці этап стане для ўдзельнікаў самым захапляльным і цікавым. У лістападзе 2023 года фільмы-пераможцы конкурсу будуць прадстаўлены ў праграме "Кіно маладых" на XXIX Мінскім Міжнародным кінафестывалі "Лістапад", не праходзячы адборачных выпрабаванняў.

Пляцоўкай для рэалізацыі творчых задумак юных талентаў стане і студыя моладзевага кіно "Смолк@". Усе ўдзельнікі, якія прайшлі першы адборачны этап, змогуць развіваць ў сценах "Беларусфільма". У тандэме з вопытнымі прафесіяналамі маладыя творцы змогуць дэталёва распрацаваць свае праекты і давесці іх да здымак фільма.

Інструкцыя аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсаў месціцца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры kultura.by (у раздзеле "конкурсы").

Настасся ЮРКЕВІЧ

Прадайце нам бацькаву булку!

20 жніўня ў Свіслачы ўпершыню пройдзе Каравай-фэст, які называецца "Бацькава булка". Перадгісторыя легендарная. Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, наведаўшы з візітам раён, пакаштаваў булку мясцовай вытворчасці. Застаўся задаволены. Маўляў, успомніў смак юнацтва.

Сюжэт паказалі на беларускім тэлебачанні. На наступны дзень людзі ў крамах пачалі прасіць: "Прадайце нам бацькаву булку". А мясцовым работнікам культуры толькі падкінь ідэю. Не, у іх і сваіх хапае, аднак такі крэатыў не выкарыстаць было б вялікім недаглядам. Так і з'явілася "Бацькава булка". Так і з'явіўся новы брэнд Свіслачыны.

Больш падрабязней пра крэатыўную задумку мы папрасілі распавесці старшыню Свіслацкага райвыканкама **Аляксандра Вярсоцкага**. Зусім не лішнім будзе нагадаць, што Аляксандр Людвігавіч — даўні сябра і памочнік "Культуры". І яго заслуга ў тым, што падпіска на наша выданне па Гродзенскай вобласці — адна з важкіх у рэспубліцы, а навіны па культурны плён Гродзеншчыны з нашых палос не знікаюць. 9 жніўня зранку кіраўнік Свіслацкага раёна ладзіў відэаканферэнцыю з прадстаўнікамі сельскагаспадарчых арганізацый ды прадпрыемстваў, але час для гутаркі з "К" усё ж знайшоў.

— Аляксандр Людвігавіч, чым свіслацкія булкі адрозніваюцца ад іншых? Мо тут сапраўды нейкі стратэгічны сакрэт крыецца?

— Ніякіх сакрэтаў. Замест іх — строгае захаванне рэцэптуры ды плюс добры настрой. Беларускі каравай гэтым заўжды адрозніваўся.

— За які кошт ладзіцца мерапрыемства?

— Абавязкова адзначце актыўнасць нашых спонсараў: Ваўкавыскага мяскамбіната, ваўкавыскага "Белладта", Гроднааблгаза.

— Чым адрозніваецца дадзены фэст ад Зажынак і Дажынак?

— Зажынкі з Дажынкамі ўшаноўваюць працу ўдзельнікаў жніва. Каравай-фэст — свята хлебапекараў. Асноўны фестывальны конкурс называецца "Матулін каравай". У ім удзельнічаюць не прадпрыемствы, а хатнія гаспадыні. Уяўляеце, які водар будзе стаяць над Свіслаччу!

— У канцэртных праграмах будуць задзейнічаны…

— …лепшыя творчыя сілы і вобласці і раёна. Мяркуюцца выступленні Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля музыкі, песні і танца "Белыя Росы", народных гуртоў Гродзеншчыны і Брэстчыны. Спадзяюся, не ўбаку застануца і зоркі беларускай эстрады.

— Хлебнае свята прадугледжвае і спартыўныя мерапрыемствы?

— Так, эстафета "Бацькава міля" чакае ўсіх ахвотных.

— Будзем спадзявацца, што хлебны брэнд займее сваю доўгую гісторыю.

Талакою — дзеля памяці

Ахвотных запрашаюць далучыцца да ўзвядзення музея воінскай славы на Буйніцкім полі.

Яго плануюць адкрыць у 2025 годзе. Аб'ёмна-планіровачная канцэпцыя музея выканана ў выглядзе Ордэна Айчыннай вайны. Выбар сімвалічны, бо менавіта гэтай узнагародай Магілёў адзначаны за мужнасць і стойкасць, а таксама поспехі ў гаспадарча-культурным будаўніцтве. Цэнтральная частка, якую займуць экспазіцыйныя залы, будзе ўяўляць сабой пяцікантовую зорку. Па баках ад яе ў выглядзе ордэнскай стужкі паўстануць дадатковыя карпусы, дзе размесцяцца актавая і канферэнц-зала, адміністрацыйна-бытавая частка. Таксама памяшканні адвядуць пад сховішча выставачнага абсталявання, фондасховішча, залу музейных заняткаў, кафэ, вестыбюль, гардэроб. Побач запланаваны амфітэатр са сцэнай і пасадачнымі месцамі на тысячу чалавек.

Цэнтральную экспазіцыю прысвеляць абароне Магілёва і Дняпроўскага рубяжа падчас Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта Буйніцкае поле было галоўным месцам гэтых падзей. Там з 10 па 26 ліпеня 1941 года гераічна змагаліся воіны 388-га стралковага, 340-га артылерыйскага палкоў і народнага апалчэння. Гэтыя падзеі атрымалі шырокі рэзананс дзякуючы пісьменніку Канстанціну Сіманаву, які ў разгар баёў знаходзіўся пад Магілёвам. Цяпер у складзе мемарыяльнага комплексу — капліца, памятны знак, абеліск на брацкім пахаванні і на магіле невядомага чырвонаармейца, узоры баявой тэхнікі і знак у гонар Канстанціна Сіманава.

Буйніцкае поле — свяшчэннае месца для многіх пакаленняў, якое даўно стала месцам правядзення абласных і гарадскіх мерапрыемстваў, патрыятычных акцый. Новы музейны комплекс раскрые подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, падкрэсліць значнасць падзей у Прыдняпроўскім краі для гісторыі краіны.

Музей плануюць узводзіць за кошт дзяржаўных сродкаў і метадам народнай будоўлі. Таму ўсіх, каму дарагая памяць пра подзвігі продкаў, запрашаюць паўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі па зборы сродкаў на будаўніцтва. Падрабязная інфармацыя для фундатараў даступная на афіцыйным сайце Музея гісторыі Магілёва.

Ёсць пытанне!

На беларускай зямлі шмат старажытных гарадоў, якія адлічваюць стагоддзі сваёй гісторыі. Так атрымалася, што ў бліжэйшы час некаторыя з іх адзначаць не проста чарговую гадавіну, а сапраўдны юбілей. Напрыклад, Докшыцы адсвяткуюць дзень горада ўжо ў гэтыя выхадныя, а Мінск і Гомель — у верасні. Як збіраюцца сустрэць падзеі?

Крысціна Гмырак, дырэктар Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Докшыцкага раёна:

— Святкуем фірменны "Фестываль дзвюх рэк", у рамках якога адбудзецца 615-ы дзень горада, мы цэлы тыдзень. Упершыню мы правядзём свята траў, у якім будзе абыграна народная "бабульчына" медыцына і вялікая колькасць карысных зёлак, якія можна знайсці ў лакацыях Докшыцкага раёна: у Бярэзінскім біясферным запаведніку, гідралагічным заказніку Галубіцкая пушча і ўздоўж ракі Сэрвач. Таксама ўпершыню адбудзецца абласны фестываль майстроў-разьбяроў па дрэве, якія выражаць скульптуры на разнастайныя сюжэты і перададуць на аздабленне раёна. Традыцыйна ў Докшыцах выступяць калектывы з мясцін, дзе працякаюць рэкі Вілія і Бярэзіна, якія бяруць вытокі на нашай тэрыторыі. Справім мы і гістарычную рэканструкцыю, на якой слова дамо і князю Вітаўту, і яваводу Манівіду, і нават імператрыцы Кацярыне II, якая ў свой час надала мястэчку Докшыцы статус горада.

Віталь Брэль, начальнік упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама:

— Праграма на святкаванне 955-годдзя Мінска яшчэ фарміруецца, але канцэпцыя ўжо вядомая. Мы хочам паказаць рознабаковаасць сталіцы, тое, што кожны можа знайсці сябе ў ёй. У рамках дня горада пройдзе эканамічны форум з удзелам гарадоў-пабрацімаў, дні адкрытых дзвярэй для ахвочых на прамысловыя прадпрыемства Мінска, у пэўныя дні можна будзе бясплатна наведаць тэатры і музеі. Да свята ў галоўным парку кожнага раёна сталіцы мы падрыхтуем захапляльныя інтэрактыўныя пляцоўкі, а 10 верасня ў Траецкім прадмесці адбудзецца рэканструкцыя на манер XIX стагоддзя. Суправаджаць падзеі будуць шматлікія СМІ. Абавязкова адбудзецца ўскладанне кветак да абеліска "Мінск — горад-герой".

Начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага гарвыканкама Мікалай Светагор:

— Юбілейны, 880-ты дзень горада Гомеля супадзе з таксама юбілейным X Міжнародным фестывалем харэаграфічнага мастацтва "Сожскі карагод", які адбудзецца з 9 па 11 верасня. Удзельнікі форуму павіншуюць гараджан з галоўнай сцэны адкрыцця свята на стадыёне "Цэнтральны", а таксама на святочных пляцоўках у раёнах. У рамках фестывалю выступяць 40 калектываў: 650 артыстаў з Беларусі, Расіі, Казахстана, Кыргызстана. На святочнай сцэне пройдуць выступленні Дзяржаўнага ансамбля "Белыя росы", народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Цітовіча, уладальніцы Гран-пры "Славянскага базару ў Віцебску — 2022" Ганны Трубяцкой і гурта Aura. Сярод ганаровых гасцей — дзяржаўны фальклорны ансамбль песні і танца Чачэнскай Рэспублікі "Нахчо". Таксама гараджан і гасцей юбілейнага форуму чакае конкурсная праграма сярод аматарскіх калектываў цыркавога мастацтва.

Асноўнай конкурснай пляцоўкай танцавальнага форуму стане Гарадскі цэнтр культуры. Тут за званне найлепшых будуць выступаць запрошаныя калектывы. У якасці ганаровага журы выступяць мастацкі кіраўнік і галоўны балетмайстар Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі **Валянцін Дудкевіч**, рэктар БДУКіМ **Наталля Карчэўская**, заслужаны работнік культуры Расіі **Валерый Бутыркін**, заслужаны артыст Чачэнскай Рэспублікі, саліст ансамбля "Нахчо" **Лом-Алі Шабіеў**.

Падрыхтаваў Павел САЛАЎЁЎ

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

Чым жыве культурная Гродзеншчына

Працоўная група Міністэрства культуры 5 жніўня здзейсніла выезд у Гродна і шэраг раёнаў Гродзенскай вобласці. Якія пытанні сферы культуры найбольш хвалююць жыхароў рэгіёна?

Валерый Грамада падчас прамой тэлефоннай лініі

У межах візіту адбыўся Адзіны дзень інфармавання, былі праведзеныя прамыя тэлефонныя лініі і асабісты прыём грамадзян. Члены рабочай групы таксама наведалі ўстановы культуры Гродзенскай вобласці, абмеркаваўшы з калегамі задачы, якія стаяць перад сферай культуры, спрабавалі знайсці шляхі рашэння праблем і ўдасканалення сумеснай работы міністэрства і рэгіянальных устаноў. Сустрэчы адбыліся ў Астравецкім, Ашмянскім, Ваўкавыскім, Гродзенскім, Дзятлаўскім, Іўеўскім, Карэліцкім, Лідскім, Мастоўскім, Навагрудскім, Скідзельскім, Слонімскім, Смаргонскім і Шчучынскім раёнах. Вынікі падобных выездаў у рэгіёны пазней традыцыйна разглядаюцца на сумесных нарадах.

У цэнтры ўвагі Адзінага дня інфармавання была тэма "Даступнае жыллё — прыярытэтная задача сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь". Гэтая галіна сапраўды з'яўляецца адной з ключавых для эканомікі нашай краіны і ў многім вызначае не толькі эканамічны рост, але і вырашэнне сацыяльных задач дзяржавы, таму асноўным прыярытэтам будаўнічай галіны з'яўляецца менавіта жыллёвае будаўніцтва. Пытанні жыллёвай палітыкі актуальныя як ніколі, бо ёсць необходнасць захоўваць малыя населеныя пункты, выраўноўваць магчымасці людзей незалежна ад таго, жывуць яны ў вялікім горадзе ці ў вёсцы. У краіне прымаюцца прававыя дакументы з мэтай падтрымкі сацыяльна неабароненых пластоў насельніцтва: маламаёмасных, сірот, людзей з інваліднасцю, шматдзетных сем'яў. Акрамя пытанняў будаўніцтва жылля, падчас сустрэч разглядаліся таксама змены ў Кодэкс аб зямлі і Кодэкс аб культуры. **Міністр культуры Анатолій Маркевіч** правёў адзіны дзень інфармавання і сустрэчу з калектывам Свіслацкай дзіцячай школы мастацтваў, на базе Свіслацкага раённага камітэта таксама адбыліся прыём грамадзян і прамая тэлефонная лінія.

У **Гродзенскім** гарадскім цэнтры культуры прайшла сустрэча з начальнікам юрыдычнага аддзела **Віталіем Юр'евічам Бейліным**. Перадусім аўдыторыю зацікавілі новаўвядзенні ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры. Адно з самых значных пытанняў — замацаванне за цэнтрамі альбо дамамі рамёстваў магчымасці рэалізоўваць сваю прадукцыю на кірмашах і выставах. Былі апаскі, што без увядзення гэтага закона продаж ручных вырабаў у такім фармаце можа быць неправамерным, і ініцыятарам гэтай папраўкі выступіла менавіта Гродзенская вобласць.

У шматфункцыянальным комплексе сацыяльна-культурнага прызначэння і творчасці моладзі **Астраўца** адбылася сустрэча з работнікамі сферы культуры намесніка начальніка ўпраўлення прафесійнага мастацтва галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва **Інай Адамовіч** адбылася ў **Карэліцкім** цэнтры культуры і народнай творчасці. Падчас асабістага прыёму да госці са сталіцы звярнулася пенсіянерка з вёскі Баравіцы, якая прапанавала ўзнавіць вечары танцаў для пажылых людзей — заяўніцы патлумачылі, што ў райцэнтры функцыянуе клуб "Пасядзім па-добраму", на базе якога будуць праводзіцца вечары танцаў.

Лідчыну наведала начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння са сродкамі масавай інфармацыі **Вікторыя Ратабыльская**, яе сустрэча з работнікамі сферы культуры рэгіёна прайшла ў Лідскім гісторыка-мастацкім музеі. Прадстаўнікі мясцовых народных калектываў выказалі жаданне развіваць міжнародное супрацоўніцтва і ўдзельнічаць у праектах такога кшталту — а для гэтага, як указала прадстаўніца міністэрства, неабходна заявіць аб сабе, стварань рэкламныя матэрыялы для самапрэзентацыі.

У **Мастоўскім** раённым цэнтры культуры сустрэчу, асабісты прыём і прамую тэлефонную лінію правяла начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці **Ірына Карповіч**. Між іншага, было закранута пытанне працы ўстаноў культуры з непаўналетнімі, прафілактычных захадаў па недапушчэнні таго, каб дзеці пападалі ў дрэнную кампанію.

У **Навагрудскай** раённай бібліятэцы адбылася сустрэча з намеснікам міністра культуры **Сяргеем Саракачом**, які пазнаёміўся з працай бібліятэкі і паразмаўляў з навучэнцамі школ, якія летам працуюць у бібліятэцы пераплётчыкамі. Намеснік міністра адзначыў, што ў Рэспубліцы Беларусь надаецца вялікая ўвага захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, аб'ём толькі дадатковага фінансавання для прац на аб'ектах з Дзяржаўнага спісу гісторыка-культурных каштоўнасцей у гэтым годзе склаў больш за 22 мільёны рублёў. На Гродзеншчыне актыўна вядуцца работы на Старым замку ў Гродне, выдзеленыя сродкі на правядзенне работ на Навагрудскім замку. Сёлета запланавана ўвесці ў эксплуатацыю Косаўскі палацава-паркавы ансамбль.

Першы намеснік міністра культуры **Валерый Грамада** правёў прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян у гарадскім доме культуры **Скідзеля**, таксама ён наведаў Скідзельскую дзіцячую школу мастацтваў і бібліятэку сямейнага чытання. Скідзяльчанамі былі выказаныя пажаданні аднавіць працу фотагуртка ў Доме культуры накшталт таго, што ёсць у мясцовым цэнтры моладзі, і вярнуцца да добрай традыцыі правядзення культурна-масавых мерапрыемстваў на беразе ракі Котры. Таксама да намесніка міністра звярнуўся 84-гадовы мужчына, які папрасіў дапамагчы аблічбаваць кінастужку 50-гадовай даўніны са знятым ім фільмам "Урок мужнасці".

А ў **Ваўкавыскім** гарадскім доме культуры прайшла сустрэча з начальнікам аддзела па кінематаграфіі **Кацярынай Панамаровай**, якая таксама наведала мясцовы раённы цэнтр рамёстваў і Ваўкавыскі вайскова-гістарычны музей імя П.І. Баграціёна. Тут звярталася ўвага на слабую педагагічную падрыхтоўку маладых спецыялістаў, таксама існуе вялікая запатрабаванасць у майстрах па святле, мастаках-грымёрах, пасціжорах і гукарэжысёрах. Акрамя таго, прагучала цікавая прапанова — вызначыць у кожным раёне краіны спецыяльнага карэспандэнта для нашай газеты. Так ці інакш, мы заўжды гатовыя да супрацоўніцтва з рэгіёнамі і з задавальненнем атрымліваем ад чытачоў з розных куткоў краіны весткі аб культурным жыцці ў іх валоціях. Дзяліцеся сваімі навінамі і вы!

Антон РУДАК
Фота з тэлеграм-канала міністэрства

На сустрэчы ў Мастах

Прамая тэлефонная лінія з Віталіем Бейліным

Сяргей Саракач з юнымі пераплётчыкамі ў Навагрудскай раённай бібліятэцы

Афішы рэгіянальных музеяў часам засмучаюць. Скрозь — выставы самадзейных жывапісцаў, вандроўныя кантактныя заапаркі, забаўкі з акулярамі віртуальнай рэальнасці. Пагаджуся, трэба даваць пляцоўкі мастакам-аматарам. І паказы экзатычных жывёл — няхепскі адпачынак для сем'яў з дзецьмі. Толькі не ператварыць бы музей у палатку з парка атракцыёнаў...

На выставе гіганцкіх насякомых

Пасядзець на цвіках і пагладзіць шыншылу

Не кожны раённы музей пахваліцца багатай калекцыяй. Бывае, рабіць арыгінальныя часовыя выставы проста няма з чаго. А трэба ж і публіцы паказаць нешта новае, і план выканаць. У дапамогу — прывазныя выставы. На многіх з іх наведвальнікам прапануюць "адчуць сябе ёгам і пасядзець на крэсле з цвікамі", "убачыць вымерлую сараканожку, увасобленую ў сучасных матэрыялах", паглядзець на прусакоў або пагладзіць шыншылу і марскіх свінак. Адкладзём спрэчкі пра этычнасць кантактных заапаркаў. Больш турбуюць іншыя пытанні. Чаму падобныя выставы надзейна прапісаліся ў музеях гісторыка-краязнаўчага і мастацкага профілю? Ці застаюцца ўвогуле гэтыя ўстановы музеямі ў класічным разуменні? Дзе жыхару райцэнтра пабачыць узоры класічнага мастацтва і сучасныя арт-эксперыменты?

Выстава Канцэпт. Выбранае ў Брэсцкай выставачнай зале

МАРСКІЯ СКАРПІЁНЫ-РАКІ СУПРАЦЬ МАСТАКОЎ

У **Бабруйскім мастацкім музеі** цяпер працуе выстава гіганцкіх насякомых. Дырэктар установы **Святлана Прывалава** тлумачыць: у пазнавальнай экспазіцыі нават дарослыя зробяць адкрыцці. Да таго ж у такіх праектаў большая наведвальнасць, чым у мастацкіх экспазіцый.

— Некалькі гадоў таму, каб трапіць на выставу Аляксандра Ісачова ў Мінску, мне давялося адстаяць у вялікай чарзе. Пазней дамовіліся з прыватным калекцыянерам і прывезлі карціны да нас — наведвальнікаў амаль не было, — дзеліцца Святлана Прывалава і дадае: — За так званыя выставы вольнага часу рэгіянальныя музеі не варта ганіць, бо без гэтай практыкі існаваць цяжка. Справа не толькі ў запытах гледачоў. Мы стараемся трымаць узровень, звычайна ладзім да 40 выстаў на год. Цяпер складаней праз пытанні з транспарціроўкай, на якую не хапае фінансаў. Тое і з рэкламай. А пабочныя арганізатары, якія прапануюць свае выставы, бяруць на сябе ўсе выдаткі па дастаўцы і рэкламе. Можна было б знайсці мастакоў, гатовых за свае грошы прывезці работы ў іншы горад і пасля забраць. Аднак аўтараў вабяць пляцоўкі Мінска або фестывальнага Віцебска. У Бабруйску, а тым больш у драбнейшых гарадах і пасёлках, у арганізацыі выставы больш зацікаўлены музей, чым мастак. Таму цяжка ўявіць, што творцы пагодзяцца аплачваць транспарціроўку з уласнай кішэні.

ДАГАДВАЦЬ МАСАМ — ПАЗІЦЫЯ ЛЯНІВЫХ

У мастацкай галерэі — філіяле **Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка** — глядзяць на выставачную дзейнасць інакш. Супрацоўнікі разумеюць, што далучыць да мастацтва ўсіх немагчыма праз розныя зацікаўленасці, і не імкнуцца падстроіцца пад кожнага. Яны бачаць сваёй задачай паказаць мясцовым і турыстам мастацтва высокага ўзроўню, як работы старэйшага пакалення, так і маладых эксперыментатараў. Да прыкладу, гэтымі днямі палачанам прапануюць пазнаёміцца з лічбавай графікай Паўла Амялюсіка, які сумяшчае класічнае мастацтва і сучасныя тэхналогіі.

— Распаўсюджанае меркаванне лянівых людзей, што публіцы падабаюцца дзіўныя выставы жывёл і падобныя. Насамрэч на іх ходзяць, бо больш няма на што глядзець. Наведвальнікі адчуваюць патрэбу ў глыбокай размове, у роздуме. Нам удалося сфарміраваць кола прыхільнікаў мастацтва, на адкрыцці выстаў прыходзіць да сотні чалавек, а часам і больш. Яны прагнуць сустрэчы з аўтарамі, каб задаць пытанні пра іх творчы шлях, асаблівасці працы, бачанне мастацтва, — расказвае дырэктар-музей. Што да перавозкі твораў, галерэя карыстаецца транспартам музея-запаведніка, але дзеля эканоміі ўсё ж даводзіцца сумяшчаць дастаўку прадметаў мастацтва з іншымі справамі па-за межамі Полацка.

На адкрыцці выставы Паўла Амялюсіка ў полацкай мастацкай галерэі

І ЯШЧЭ ПРА РЭПУТАЦЫЮ

Нават з мінімальным бюджэтам можна рабіць цуды. З прыватных размоў ведаю, што нямала мастакоў возяць персанальныя выставы ў рэгіёны за ўласны кошт. Пытанне ў тым, ці знойдзецца ў невялічкім горадзе музей-шчык, здольны наладзіць кантакт з такімі аўтарамі-энтузіястамі.

Транспартнае пытанне актуальнае і для **карціннай галерэі "Традыцыя" імя Г.М. Пранішнікава ў Светлагорску**. Для дастаўкі выкарыстоўваюць аўтамабіль бібліятэчнай сістэмы, таму неабходна падстройвацца пад чужы графік і аплачваць паліва. Але гэта не перашкаджае радаваць гараджан яканымі праектамі. Тры залы ўстановы адведзеныя пад часовыя экспазіцыі, і новыя выставы адкрываюцца раз на месяц. Гаўрыіл Вашчанка, Леанід Шчамялёў, Васіль Шаранговіч, Арлен Кашкурэвіч, Павел Масленікаў — работы гэтых і яшчэ дзясяткаў вядомых майстроў пабывалі ў светлагорскай галерэі за трыццацігадовую гісторыю. Як расказвае намеснік дырэктара **Дар'я Літвіненка**, высокую планку задаў былы кіраўнік Ізяслаў Катляроў, які стаяў ля вытокаў галерэі і запачаткаваў супрацоўніцтва з аўтарытэтнымі мастакамі. І дагэтуль установа сябруе з многімі аўтарамі, для якіх прыехаць у Светлагорск — радасць.

З наведвальнасцю, дарэчы, і без перасоўных заапаркаў усё цудоўна. Штонядзелю ў галерэю завітваюць групы з мясцовага санаторыя. Калі раптам да планавых лічбаў не дацягваюць, супрацоўнікі выязджаюць з акцыямі ва ўстановы адукацыі і на прадпрыемствы горада.

Калі заснавальнікі музеяў у рэгіёнах шкадуюць грошай на транспарціроўку работ, можа, заняцца гэтым на ўзроўні рэспублікі? Вялікі працэнт работ захоўваецца ў фондасховішчах, і лепшае з таго, што не прадстаўлена ў пастаянных і часовых экспазіцыях вядучых музеяў, можна правезці па раённых установах. Гэта яшчэ і навучальная акцыя для работнікаў сферы культуры. Супрацоўнікі рэгіянальных музеяў і галерэй на месцы атрымалі б своеасаблівы майстар-клас ад сталічных калег па тонкасцях экспазіцыйнага дызайну і экскурсій. Арыентавацца можна на вопыт мабільнай экспазіцыі музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны або Беларускага саюза мастакоў. Апошнім часам грамадскае аб'яднанне прэзентуе ў абласных цэнтрах міні-версіі буйных рэспубліканскіх праглядаў — "Графіка года", "Канцэпт", Трыенале жывапісу, графікі і скульптуры.

Даніл ШЭЙКА

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

Лідзія Скачко

Абітурыенты? Ужо студэнты!

Гэтым тыднем у творчых ВНУ краіны заканчваецца ўступная кампанія: спісы залічаных на бюджэтную форму атрымання адукацыі зявіліся некалькімі днямі раней, цяпер вызначаюцца тыя, хто працягне сваё навучанне на платнай аснове.

— Вынікі сёлетняга прыёму ў Беларускую дзяржаўную акадэмію музыкі, — гаворыць першы прарэктар БДАМ, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт **Лідзія Скачко**, — больш чым задавальняльныя, усе паказальнікі цалкам выкананы. У нашым ВНУ апрыёры не можа быць "ашаламляльных" конкурсаў па некалькі дзясяткаў чалавек на месца, бо ўсе спецыяльнасці, па якіх мы рыхтуем студэнтаў, эксклюзіўныя: навучанне пачынаецца літаральна з дзяцінства і бесперапынна працягваецца не да моманту выпуску, а ўсё жыццё. Цягам падлеткавых і юнацкіх гадоў праходзіць, калі можна так сказаць, "натуральны адбор" найбольш таленавітых і адданых мастацтву, без якога яны не ўяўляюць сваё жыццё. Выязджаючы на дзяржаўныя іспыты, конкурсы, канцэрты, што ладзяцца ў каледжах, нашы педагогі прыглядаюцца да маладых музыкантаў. Задоўга да ўступных іспытаў ладзяцца кансультацыі, у час якіх адсейваюцца магчымыя выпадковыя абітурыенты: параўнаўшы сябе з іншымі, яны прымаюць рашэнне паступаць у іншыя ВНУ. Так што сёлетні конкурс 171 чалавек на 141 бюджэтнае месца (а на платнай аснове займаюцца толькі іншаземцы) трэба лічыць дастаткова высокім. Як заўжды, шмат жадаючых навучацца акадэмічным спевам. Але і на такія спецыяльнасці, як музыказнаўства і кампазіцыя, — па сем чалавек на пяць месцаў. Больш высокім, чым звычайна, атрымаўся конкурс на аркестравым факультэце. Па ўмовах VI Рэспубліканскага адкрытага конкурсу выканаўцаў на аркестравых інструментах імя Яўгена Глебава, што ўвесну ладзіўся ў Магілёве, без іспытаў былі залічаны 27 пераможцаў гэтага творчага паборніцтва. За астатнія бюджэтныя месцы разгарнулася сапраўдная барацьба.

Асаблівасцю прыёму дакументаў было тое, што запоўніць заяву можна было папярэдне на сайце. А непасрэдна здаць неабходныя дакументы — у прызначаны час на аснове папярэдняга запісу, каб не ўтвараць непатрэбных чэргаў і не марнаваць час. Добра папрацаваў і атрад валанцёраў. За ходам іспытаў сачыла камісія, старшынёй якой быў прызначаны намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір Гракун. Ніякіх скаргаў, апеляцый не паступала. Ад залічаных мы чулі толькі захопленыя водгукі, як добра ўсё было арганізавана.

Паспяховым было сёлетняе размеркаванне выпускнікоў. На працу ўладкаваны ўсе — 141 студэнт першай прыступкі вышэйшай адукацыі і дзевяць магістрантаў. Сярод самых зорных імёнаў, што яшчэ ў гады вучобы ўзрушылі сваёй творчасцю і конкурснымі перамогамі музычную грамадскасць Беларусі і замежжа, — кампазітар Ігар Комар, які будзе выкладаць на нашай кафедры кампазіцыі, оперная салістка Настасся Міхнавец, залічаная ў штат Вялікага тэатра Беларусі, акардэаніст Віктар Шабела, які выправіўся на сваю радзіму, у Брэст, і многія іншыя маладыя, але ўжо вядомыя музыканты. 56 чалавек патрапілі ў канцэртныя арганізацыі, уключаючы тэатры і творчыя калектывы рэспублікі, 43 стануць выкладаць у каледжах, 35 — у школах мастацтваў, бо вельмі важна, каб адораныя дзеці адразу займаліся ў добра падрыхтаваных спецыялістаў, што маюць і педагагічныя веды, і тую ж выканальніцкую практыку. Адразу восем выпускнікоў папоўняць шэрагі выкладчыкаў і канцэртмайстраў Акадэміі музыкі, што забяспечвае пераемнасць лепшых традыцый айчынных педагагічных школ у галіне акадэмічнага музычнага мастацтва. Так што выпуск-2022 быў моцным. Спадзяемся, не горшымі спецыялістамі выйдуць ад нас і наваспечаныя студэнты, сярод якіх многа вельмі перспектыўных маладых музыкантаў, што ўжо добра выявілі свой творчы патэнцыял.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Арт-серада для культурнага асяроддзя

Цёплы летні вечар, цэнтр горада, музыка, вершы, танцы, добры настрой, які па серадах дорыць гродзенцам культурны цэнтр "Фестывальны". Праект "Арт-серада" ўжо палюбіўся жыхарам Гродна, кожнае мерапрыемства прыцягвае ўсё большую колькасць удзельнікаў.

Традыцыя праводзіць такія мерапрыемствы зарадзілася ў 2020 годзе, але з-за ковідных абмежаванняў не насіла масавы характар. Сёлета гараджане з задавальненнем збіраюцца на скрыжаванні вуліц Урыцкага і Тэльмана і ўдзельнічаюць у майстар-класах, віктарынах, слухаюць выступленні творчых калектываў і выканаўцаў.

— Сустрэчы па серадах ужо ведаюць і палюбілі многія гараджане, — расказвае загадчык культурнага цэнтра "Фестывальны" Эдгар Рэц. — Арганізуем арт-пляцоўкі і для дзяцей, дзе яны могуць памаляваць крэйдай, паўдзельнічаць у конкурсах і атрымаць прызы.

Кожная "Арт-серада" мае сваю тэматыку. Першая прайшла пад дэвізам "Запальваем лета". Да свята Купалля арганізавалі "Купальскі вянок". Выступілі творчыя калектывы Гродзенскага гарадскога цэнтра культуры — вакальны ансамбль "Фабрычны каларыт", народная эстрадная студыя "Струны сэрца". Сваё майстэрства прадэманстраваў вакальны ансамбль "Рада-Дар" музычнага тэатра "Рада". Спецыялісты Цэнтра рамёствў "Спадчына" правялі майстар-класы.

На адну са жнівеньскіх сустрэч запрасілі ўдзельнікаў літаратурнага аб'яднання "Надзея", якія прачыталі свае вершы, прысвечаныя лету. Сустрэча прайшла інтэрактыўна — з віктарынамі і прызамі, песнямі і танцамі.

— Не першы раз прыходжу сюды ў сераду, — гаворыць супрацоўніца Гродзенскага абласнога інстытута развіцця адукацыі Любоў Біруковa. — Па сваёй прафесійнай дзейнасці звязана з літаратурным аб'яднаннем "Надзея", у склад якога ўваходзіць шмат былых настаўнікаў, таму сёння прыйшла на сустрэчу з паэтамі-аматарамі з вялікім задавальненнем. Такія мерапрыемствы — цудоўная магчымасць адпачыць, натхніцца творчасцю, сустрэцца са знаёмымі.

Як адзначае Эдгар Рэц, завяршальнае мерапрыемства праекта "Арт-серада" (на рускай мове назва мае некалькі сэнсаў: і дзень тыдня, і культурнае гарадское асяроддзе, якое фарміруецца вось такімі мерапрыемствамі) закрыецца музычна-паэтычнай праграмай "Музыка лета".

Арт-серада — не адзіная магчымасць гарадзенцаў адпачыць у творчай абстаноўцы. Ужо на працягу некалькіх гадоў Гродзенская філармонія рэалізуе мастацкі праект "Канцэрты на балконе". Кожны летні аўторак артысты філармоніі на адным з балконаў на цэнтральнай пешаходнай вуліцы Савецкай выступаюць з новай праграмай.

Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ
Фота аўтара

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

Зорка нарадзілася: вінаватая магія?

Кажуць, каб дасягнуць мары, трэба думаць маштабна і верыць у свае шалёныя ідэі. Амбіцыйная, яркая і дзёрзкая! Такой з'яўляецца наша новая гераіня Паліна Суворава. У свае 22 гады выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў — пастаянная ўдзельніца самых маштабных эстрадных праектаў нашай краіны. Памочніца рэжысёра, актрыса, вядучая — як гэта ўсё змяшчацца ў адным чалавеку?

За кожнай таленавітай асобай стаіць яе сям'я. Бацькі Паліны ў выхаванні дачкі прытрымліваюцца зладжаных прынцыпаў: нічога не навязваць, уважліва слухаць і падтрымліваць. Дзякуючы такой атмасферы ў сям'і дзяўчына ні на секунду не сумнявалася ў сваім прафесійным выбары. Як вядома, у Новы год здараюцца цуды. Сустракаючы 2018-ы за святочным сталом, наша гераіня агучыла свой намер: паступлю ва Універсітэт культуры і мастацтваў, на іншае не пагаджуся. Усталёўкі абітурыенткі былі сур'ёзныя, бо яна не прывыкла даваць сабе права на памылку.

— Як вы абралі сваю будучую прафесію?

— На працягу 11 гадоў у школе я шмат часу праводзіла ў кабінеце педагога-арганізатара. Гэта былі не тыповыя прагулы школьніка, як мяркуюць некаторыя настаўнікі. Дзякуючы гэтым сустрэчам я выяўляла сваю творчую асобу. Калі прыйшоў час абіраць ВНУ, выразна ўсведамляла, што жыць і вучыцца толькі мне. Таму трэба зрабіць самастойны выбар і думаць, дзе можна ў поўнай меры раскрыць свой патэнцыял. БДУКМ — месца, дзе душы таленавітых людзей яднаюцца ў адзіным творчым парыве. Пагутарыўшы з выпускнікамі, пачытаўшы шмат водгукаў і рэкамендацый, прыслухаўшыся да свайго сэрца, я зразумела: факультэт мастацкай культуры — маё!

ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

З дзяцінства Паліна прывыкла настойліва працаваць над сваімі жаданнямі. "Галоўнае верыць у свае сілы, а калі да гэтага прыкласці пэўныя намаганні, даможашся 100% поспеху!" — запэўнівае дзяўчына. Яшчэ да паступлення будучая студэнтка пазнаёмілася з універсітэтам, наведваючы падрыхтоўчыя курсы.

— У студэнцкія гады поруч з намі з'яўляюцца настаўнікі, якія дапамагаюць вызначыцца з жыццёвымі арыенцірамі. Хто для вас стаў такой асобай?

— У маім універсітэце працуюць выкладчыкі з неверагодным унутраным светам, яны гатовы падарыць кожнаму студэнту свае веды і падзяліцца доследам. Але ёсць адзін асаблівы чалавек, які ўразіў мяне свае прафесіяналізмам. Ён стаяў ля вытокаў стварэння такіх буйных фестывалей, як "Славянскі базар у Віцебску", "Джынкі", "Памяць", "Песні свету" ў Малдове і шмат іншых. І выхаваў дзясяткі таленавітых вучняў, якія цяпер працуюць у розных кутках свету. Гэты Настаўнік — чалавек-слова, чалавек- талент, легенда нашага часу! Я з вялікім гонарам і падзякай кажу, што станаўленне маёй асобы прайшло пад чуйным кіраўніцтвам Аляксандра Дзмітрыевіча Вавілава, дацэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Гэты чалавек выхаваў маю ўнутраную волю, даў магчымасць выявіць сябе і дазволіў набірацца досведу ў мэтра.

Навучанне ў цэлым абточвала мяне як асобу: пачынаючы з уступных экзаменаў і развіваючы мяне не толькі ў спецыяльнасці. Са школьных часоў я была старастай і брала на сябе адказнасць за ўсе важныя пытанні. Гэту ж традыцыю працягнула ва ўніверсітэце, там мае лідарскія якасці толькі памацнелі.

СПЯВАЦЬ "ЗЯЛЁНЫ ВІНАГРАД" З АЛЯКСАНДРАМ САЛАДУХАМ

Выпускнікі творчых ВНУ ў адзін голас раяць будучым студэнтам надаваць час не толькі навучанню, але і самаразвіццю. Максімальна выяўляць сябе ў розных праектах, браць удзел ва ўніверсітэцкіх імпрэзах і канцэртах — усё гэта створыць неацэнны багаж ведаў і карысных знаёмстваў.

— Маглі б вы расказаць пра самыя яркія эпізоды вашага студэнцкага жыцця?

— Ніколі не забудуся пра вопыт удзелу ў фестывалі "Славянскі базар у Віцебску". На працягу навучання Аляксандр Дзмітрыевіч браў мяне памочніцай рэжысёра і імкнуўся расказаць пра ўсе сакрэты і традыцыі гэтага фэсту. Я атрымлівала практычныя веды, гэта здаецца мне неацэнным.

Усе німаверныя сустрэчы адбываюцца менавіта на маштабных імпрэзах. Ведаеце, я стала тым чалавекам, які бачыў зорак праз экран тэлевізара, а потым апынуўся поруч з імі за сцэнай. І на тваю сумачку выпадкова сядзе Вольга Бузава, ты дасі "пяць" Валерыю Лявонцьеву і праспяваеш з Аляксандрам Саладухам яго легендарны "Зялёны вінаград" пад гасцініцай у 4 раніцы. І гэта толькі маленькія драбніцы вялікай эстрадная прыгоды!

За чатыры гады, дзякуючы Аляксандру Дзмітрыевічу, я набыла каласальны досвед. Пад яго кіраўніцтвам стала часткай буйных конкурсаў, а таксама прыклала не мала ўласных сіл у арганізацыю імпрэз. Нават паспела прымерыць на сябе ролю вядучай, што было для мяне зусім нова.

МАГІЯ ЎНУТРЫ НАС

Звычайна яркаму пачатку ўласцівы не менш бліскучы фінал. На апошняй мяжы Паліна павінна была вызначыцца з тэмай дыпломнай работы. Супадзенні не выпадковыя. Паважаны выкладчык студэнткі Аляксандр Вавілаў вырашыў рэалізаваць сваю маштабную задумку: паставіць мюзікл "Магія". Для такога велізарнага праекта спатрэбілася надзейная каманда. Такім чынам наша гераіня стала актрысай мюзікла "Магія", які і быў тэмай яе дыпломнай работы.

— Раскажыце, як праходзіла падрыхтоўка да прэм'еры?

— Ад стварэння ідэі да яе рэалізацыі прайшло два гады. Спачатку прапісваўся сцэнарый, стваралася музыка, змяняліся дыялогі, збіраліся тэхнічныя групы. З артыстамі праца доўжылася год: маўленне, балет, пластычныя вырашэнні, рэпетыцыя эпізодаў, поўныя прагоны — усё адточвалася да дэталяў. Мы літаральна начавалі ў рэпетыцыйнай зале. Да гэтага мы бачылі падобнае толькі ў фільмах, дзе ствараюцца буйныя праекты і трупа ночы напралёт рэпеціруе.

Я была не толькі памочніцай рэжысёра, але яшчэ і артыстам. Мела ролю вясковай дзяўчыны, якая прыехала заваёўваць сталіцу. У прынцыпе гэтак і ёсць у жыцці. Сама я з горада Жлобіна. Мне было вельмі проста пранікнуцца гэтай роллю, бо я грала саму сябе.

Для мяне стварэнне мюзікла на падмостках новага Спартыўна-культурнага комплексу БДУКМ стала дзеціншчам, нечым родным і вельмі дарагім сэрцу. Мне не хацелася ісці з рэпетыцый, а хацелася ўкласці ў гэту справу як мага больш. Мае заданні былі абсалютна рознабаковымі: ад стварэння партрэтнай здымкі артыстаў да арганізацыі цёплых сустрэч трупы мюзікла.

МАСКІ ДЛЯ АРТЫСТА — ГЭТА КРЫЖ

Чаканая прэм'ера мюзікла адбылася 18 мая 2022 года ў Мінску. Да гэтага "Магія" пераносілася ў сувязі з эпідэміялагічнай сітуацыяй. "Санітарныя маскі для артыста — гэта крыж. Калі не бачны эмоцыі, а толькі вочы, ствараецца іншае ўражанне", — прызнаецца Паліна Суворава.

Пастаноўку А.Д. Вавілава можна лічыць унікальнай. У мюзікле дзеля адной мэты з'ядналіся выкладчыкі, беларускія і кітайскія студэнты. Атрымаць асалоду ад творчасці таленавітай трупы змаглі і жыхары Бабруйска на Фестывалі народнай творчасці. У асобны дзень мюзікл прэзентаваў сябе на "Бабруйск-арэне" са сцэнічным агладам у 360 градусаў.

— Вас можна павіншаваць з дзвюма прэм'ерамі. Як бы вы апісалі свой выступ у Мінску і ў Бабруйску?

— Ты выходзіш на сцэну і не выконваеш ролю, а жывеш. Сціраюцца межы паміж сэрцам гледача і табой.

У Бабруйску амаль не было часу на рэпетыцыі, бо мы некалькі дзён працавалі памочнікамі рэжысёра на фэсце. Менавіта па прыездзе мы зразумелі, што цяпер убачым, чаму навучыліся. Тэхнічна і фізічна гэта было складана, бо ты спяваеш, граеш, узаемадзейнічаеш з гледачом. Тым часам ты стаіш на сцэне з аглядам у 360 градусаў і ў дадатак да гэтага цябе здымаюць камеры, якія трансліруюць дзеянне на экраны. Было ўсё: кветкі, слёзы, авацыі.

Прэм'ера ў Мінску прайшла з ашаламляльным поспехам. Калі кулісы былі яшчэ закрыты і прагучалі словы нашага канферансье, усярэдзіне завіравала кроў. Узнімаецца заслона, светлавыя гарматы асляпляюць табе вочы, мурашкі пакрываюць тваё цела, і ты разумееш: няма права на памылку. У зале сядзяць бацькі, якія ўбачаць вынікі тваёй доўгай працы. Менавіта тады, калі глядач сустракаецца паглядам з акцёрамі, прыходзіць усведамленне, што пра такі фінал можна марыць.

Дзіўна было знаходзіцца на адной сцэне з Аляксандрам Дзмітрыевічам, які прыняў цябе, як маленькую, на першым курсе. Развіў акторскія задаткі, пластыку, драматургію, сфарміраваў паняцце пра сцэну і пра тэатр. І вось вы робіцеся калегамі па цэху і ствараеце нешта неверагоднае.

Наша гераіня размеркавалася ў родны ўніверсітэт у якасці культурнага арганізатара. І ўжо сёння ў таленавітай дзяўчыны ў распрацоўцы некалькі творчых праектаў, якія ў хуткім часе яна прэзентуе шырокай публіцы. Упэўненыя, імя Паліны Суворавай прагучыць на вялікай сцэне яшчэ не раз.

Настасся ЮРКЕВІЧ

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY № 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

Святар у мюзікле? Цудоўна!

Рэпертуар Маладзёжнага тэатра эстрады папоўніўся доўгачаканым мюзіклам-біяграфіяй “Гур’янаў”

Спектакль рыхтаваўся доўга і вельмі старанна. Была нават думка перанесці прэм’еру на пачатак новага сезона. Але ўсё атрымалася. Бог дапамог? Мабыць, бо ў цэнтры аповеду — айцец Мікалай Гур’янаў. Праўда, не ўсё ягонае жыццё, а толькі адна са старонак, прысвечаная некалькім здзейсненым цудам.

Хай не засмучае гасьці з’яўленне асобы святара на эстрадзе і ў мюзікле. Мінулі савецкія часы, калі гэты жанр лічыўся заганным і творцы імкнуліся камуфляваць яго назвамі кшталту “зонг-опера”, “фольк-опера”, “музычны спектакль” і да т.п. Заходняя культура мае выдатны прыклад увасаблення самога Госпада — у знакамітай рок-оперы Уэбера “Ісус Хрыстос — Суперзорка”. Праваслаўная традыцыя куды больш сціплая на падобныя падзеі, але на цяперашнюю пастаноўку было атрымана бласлаўленне, і ніякага супрацьстаўлення з боку вернікаў, як гэта раз-пораз апошнім часам здараецца, не было. Дый быць не магло! Бо ў новым творы няма ніякіх захадаў, што маглі б быць інтэрпрэтаваныя як праваакацыйныя, адшліфаваная кожная дэталь.

Лібрэта, як і ў многіх іншых прэм’ерных мюзіклах гэтага тэатра, створана мастацкім кіраўніком калектыву, рэжысёрам Уладай Арцюкоўскай. Такое сумяшчэнне аўтара і пастаноўшчыка ў адной асобе мае плён: ва ўсіх творах — па-рэжысёрску добра распрацаваная драматургія, трапныя тэксты з патэнцыйна крылатымі фразамі, ніякага шматслоўя, непрымальнага для музычнага развіцця.

Плённым стаў і тандэм з кампазітарам Аляксандрам Сухаравым. Будучы салістам гэтага тэатра, ён добра разумее і вакальную прыроду, і спеўныя магчымасці кожнага артыста. Таму, як і У. Арцюкоўская, адразу піша той ці іншы матэрыял на пэўную творчую асобу з усімі яе асаблівасцямі: спевакі маюць больш разгорнутыя і складаныя вакальныя партыі, артысты размоўнага жанру не імкнуцца спаборнічаць з імі, выконваючы іншыя па музыцы нумары ці спяваючы разам з астатнімі, таму складаецца ўражанне, што ўсе папраўдзе выступаюць на роўных. Дапамагае і ўменне карыстацца падгучкай, і двухпавярховая сцэнаграфія (мастак — Вольга Грыцаева).

Харавік-дырыжор па адукацыі, А.Сухараў добра ведае царкоўныя спеўныя традыцыі, таму ў музычнай стылістыцы мюзікла адчуваецца натуральны і вельмі ўдалы зварот да інтанацыйнасці, уласцівай старадаўнім знаменным песняспевам: на ёй пабудавана большасць мелодый, што гучаць пры гэтым сучасна і свежа. Не абышлося і без уласцівай мюзіклам рок-стылістыкі. Але, улічваючы духоўную тэму, зварот да яе ў асобных нумарах мае грунтоўную нагоду: да айца Мікалая часцяком прыязджалі рок-музыканты — па бласлаўленне і паратунак. У прыватнасці, сярод герояў спектакля аказваецца рэальны лідар знакамітага гурта “Аліса” Канстанцін Кінчаў (Яўген Волчак). Цэласнасці спектакля спрыяе скразное дзеянне, сістэма лейтматываў, распаўсюджаная ў музычна-тэатральных жанрах.

Усе акцёрскія работы — найвыдатнейшыя. У айцы Мікалаі цяжка пазнаць Руслана Чарнецкага (грымёр — Настасся Чарнецкая), які паралельна з гэтым спектаклем паўстае, да прыкладу, графам Монтэ-Крыста ў Нацыянальным драмтэатры імя М.Горкага. Ролю больш маладога святара прымераў удзельнік “Верасоў” Мікіта Касцюкевіч. Новую для сябе галіну засвоіла заслужаная артыстка Беларусі Жанет: звычайна лірычная, кранальна тонкая эстрадная прымадонна раптам паўстала ў яркай характарнай ролі скаржніцы-плятткаркі Лейкінай, якая толькі і робіць, што збірае на ўсіх кампрамат. Фізіка Аляксея Мечнікава, што праз каханне прыходзіць да веры, увасабляе Арцём Пінчук, які дакладна і без анякага тэатральнага ўціску перадае псіхалагічныя ваганні свайго героя (у тым ліку праз змену тэмбравых адценняў у найскладанейшай вакальнай партыі). Яго абраніцу Вольгу Скварцову, выратаваную ад смяротнай хваробы, з уласцівай ёй мяккасцю грае і спявае Вольга Калеснікава. Увогуле пералічваць трэба ўсіх: Кацярыну Мядзведзеву (Ягораўна), Андрэя Кунца (Пятруша), Уладзіміра Мікалаева (Дзям’янаў), Кацярыну Муратаву (Анёл), артыстаў балета, што становяцца то рыбакамі, то прыхаджанамі.

Спектакль склаўся. Застаецца пажадаць яму пасяховага сцэнічнага і, магчыма, фестывальнага жыцця.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Сяргея ЖДАНОВІЧА

СТУЖКА ЖЫЦЦЯ

АЎТОГРАФ З БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

Восіп Цадкін

1890 — 1967 гг.

Скульптар, графік, мастак прыкладнога мастацтва, прадстаўнік “Парыжскай школы”, адзін з найбуйнейшых прадстаўнікоў авангарднага мастацтва скульптуры XX ст.

Творы мастака прадстаўлены ў многіх музеях свету, вялікая колькасць яго карцін і скульптур захоўваецца ў прыватных калекцыях. У Парыжы ў 1982 г. на месцы майстэрні мастака быў адкрыты музей Цадкіна, у якім захоўваецца мноства яго твораў. Акрамя гэтага, памяць аб вялікім творцы ўшанавана ў назве адной з парыжскіх вуліц.

У Беларусі можна пабачыць 7 твораў Восіпа Цадкіна (4 скульптуры і 3 гушы). Яны экспануюцца ў карпаратыўнай калекцыі “Белгазпрамбанка” і адносяцца да розных перыядаў творчасці мастака.

Пад уплывам паэтаў Макса Жакоба і Гіёма Аполінэра Цадкін адкрыў у сабе літаратурныя здольнасці і нават пачаў пісаць вершы і прозу. Творчая спадчына мастака налічвае мноства паэтычных твораў, а таксама кнігі “Падарожжа ў Грэцыю”, “Тры свечкі” (Амстэрдам, 1955), “Клетка і птушка” (Парыж, 1968).

Адзіны сын скульптара, дацкі псіхіятр Нікалас Хасле, нарадзіўся па-за шлюбам і не змог пратэндаваць на маёмасць бацькі. Адзіным уладальнікам правоў на спадчыну скульптара пасля смерці яго жонкі была прызнана сталіца Францыі.

1890 г.
Нарадзіўся 14 ліпеня ў Віцебску ў сям’і крышчонага яўрэя і дачкі шатландскіх суднабудаўнікоў.

“Арфей”, 1965 г.

1900 — 1904 гг.
Вучыцца ў першым Віцебскім гарадскім вучылішчы, дзе пры рамесным класе дадаткова навучаецца сталярна-такарному майстэрству.

“Музыканты”, 1927 г.

1905 — 1909 гг.
Адпраўляецца да сваякоў на поўнач Англіі, дзе на працягу года вучыўся ў пансіёне, а вечарамі наведваў урокі скульптуры ў мясцовай мастацкай школе. Пазней перабраўся ў Лондан, дзе наведваў Брытанскі музей, вучыўся ў Політэхнічнай школе, а таксама вывучаў разьбу па дрэве ў Школе мастацтваў і рамёстваў.

1909 г.
Прыязджае ў Парыж, каб працягнуць адукацыю. Паступае ў Нацыянальную вышэйшую школу прыгожых мастацтваў, дзе вучыцца паўгода, аднак хутка расчараўваецца ў акадэмічным падыходзе і больш не наведвае заняткі, пакінуў графічны партрэт Цадкіна.

“Танец”, 1915 г.

Тут малады Цадкін атрымлівае першыя навыкі працы з дрэвам, што ў далейшым спатрэбіцца ў яго скульптурнай творчасці. Першыя два гады скульптар навучаўся разам з будучай сусветнай зоркай — мастаком Маркам Шагалам. Акрамя гэтага бярэ ўрокі малявання ў школе-студыі Юдаля Пэна.

У гэты момант Восіп Цадкін канчаткова вызначаецца са сваёй прафесіяй і абірае сваім шляхам мастацтва. Летнія месяцы малады скульптар бавіў у Віцебску, але апошні раз моцна сварыцца з бацькам, які не падтрымлівае яго выбар, і з’язджае ў Францыю. Больш на радзіму Цадкін не вернецца.

“Партрэт Восіпа Цадкіна”, Амедэа Мадыльяні

Скульптара больш вабіць авангарднае мастацтва, ён селіцца на Манпарнасе і здымае кватэру-студыю ў знакамітым “Вулі”. Выстаўляецца ў Восеньскім Салоне і Салоне незалежных. Хутка прыходзіць вядомасць.

Уваходзіць у кола аматараў сучаснага мастацтва, кантактуе з многімі знакамітымі творцамі таго часу — Аполінэрам, Брынкушы, Пікаса, Бурдэлем, Маціссам, Дэпоне, Суцінам, Мадыльяні. Апошні нават пакінуў графічны партрэт Цадкіна.

Гіём Аполінэр

Амедэа Мадыльяні

Канстанцін Брынкушы

Пабла Пікаса

Хаім Суцін

“Разбураны горад” — самая знакамітая скульптура Цадкіна. Гэта вялікі бронзавы манумент, прысвечаны нямецкай бамбардзіроўцы Ратэрдама, якая разбурыла сярэднявечны цэнтр горада. Ён быў адкрыты ў 1953 годзе ў Ратэрдаме і з’яўляецца галандскім нацыянальным помнікам.

1820 г.
Ажаніўся з мастачкай Валянцінай Пракс. Дзяцей у шлюбе не было.

1915 — 1917 гг.
Падчас Першай сусветнай вайны ўступае добраахвотнікам у французскую армію. Працуючы санітарам у палявым шпіталі, трапляе пад газавую атаку немцаў, цяжка захворвае і ў хуткім часе дэмабілізоўваецца.

Вайна пакідае моцны адбітак у свядомасці мастака. Перажываючы сур’ёзны душэўны крызіс, ён вяртаецца ў Парыж і шукае аддушыну ў мастацтве.

1920 — 1937 гг.
У брусельскай галерэі “Кентаўр” (Бельгія) скульптар праводзіць першую персанальную выставу, пасля чаго працягвае паспяхова выстаўляцца ў галерэях і музеях розных краін свету. Яго творы ляцяць у Парыжы, Маскве, Ленінградзе, Венецыі, Бруселі, Хэневе, Празе, Нью-Ёрку.

Да Цадкіна прыходзіць сусветная вядомасць. Яго творчасць набывае непаўторны, пазнавальны стыль, якому ўласцівы элементы архаічнага мастацтва і кубізму.

“Паслаццік”

1918 г.
Сумесна з Амедэа Мадыльяні і Майсеем Кіслінгам арганізоўвае выставу, дзе прадстаўлены 25 малюнкаў на ваенную тэму. Яна мела вялікі рэзананс у мастацкім асяроддзі Парыжа.

1939 — 1945 гг.
Другая сусветная вайна вымушае мастака пераехаць у ЗША, дзе яго творчасць прысвячаецца антываеннай тэматыцы

“Вяртанне блуднага сына”, 1952 г. Карпаратыўная калекцыя “Белгазпрамбанка”

1945 г.
Вяртаецца ў Парыж, дзе працуе пераважна ў галіне станковай і манумэнтальнай скульптуры. Важнай часткай дзейнасці мастака і скульптара робіцца педагагічная работа — ён выкладае ў майстэрнях Акадэміі Гранд Шам’ер.

1967 г.
Памёр 25 лістапада ў Парыжы ва ўзросце 77 гадоў. Пахаваны на Манпарнасскіх могілках.

1950 — 1956 гг.
Перыяд найбольшага ўздыму ў творчасці. За гэты час мастак праўдзі больш за 100 выстаў, атрымаў мноства прэстыжных узнагарод і прэмій, сярод якіх Гран-пры ў галіне скульптуры на Венецыянскім біенале ў 1950 годзе, Нацыянальная прэмія Францыі ў галіне мастацтва ў 1960 годзе, ордэн Ганаровага легіёна (1966).

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

Збіраю вітражнае святло

Тыдзень хадзіў без ідэй. Не хадзіў, а бадзяўся. Як ялавая карова. Без ідэй кепска: і жанчыны ўвагі не звяртаюць, і ціск узнімаецца. Злуешся, прыслухоўваешся ды прыглядаешся. А раптам заблішчыць, зайграе. Пад нагамі, на галінах, у павеве ветрыку ці ў поглядзе незнаёмай... І — вось яно!

Падчас таямнічага Гальшанскага фэсту

Дзіцячыя чытачы на Астравеччыне не сумуюць

У Парэччы прыселі на дарожку

Тут, як у нас кажуць, трэба *лаваць*, трымаць і карыстацца. Мне шчасціць з перыядычнасцю ў тыдзень.

ФАРБЫ ШЧАСЦЯ

Упершыню заўважыў гэты цуд у Гальшанскім касцёле. Жонка стаяла насупраць вітража, а тут з-за хмары — сонейка. І выбухнула ўсё, заззяла! Вочы, валасы, усмешка... І ўсё гэта — пяшчотным каляровым дотыкам. З таго часу і шукаю вітражы. А той, хто свет расфарбоўвае, то смяецца, то бровы хмурыць.

ЭХ, МУЖЫК!

Паехалі з сынам у коласаўскую Альбуць. Покуль Сцёпка леснічоўку аглядаў (нават асадку Песняра далі патрымаць!), я кабет на выхадзе затрымаў. Кабеты — справа сур'ёзная. Тут без мітусні трэба. А іх — аж пяцёра на легкавіку. Сёння яшчэ ў Грушаўку да Рэйтана паспелі заскочыць. А на мінулым тыдні Мірскі замак даследавалі. У бліжэйшай перспектыве — экскурсія ў Любчу і Шчорсы. Якія малайчыны! Я пра мужыкоў іхніх пасаромеўся пытацца. Напэўна, кінуліся падлогу мыць ці ў бібліятэку пабеглі. А раптам не? Страшна падумаць!

ПЕРАЖЫВАЮ

У Барунах, дзе Рак-Міхайлоўскі заснаваў настаўніцкую семінарыю, уразіла калісьці ўніяцкая царква. Нават не вонкавы выгляд, а ўнутранае ўбранне. Храм зачынены быў, але для мяне і двух маіх сыноў (яшчэ малых тады) адчыніў дзверы семінарыст-практыкант. Ён сам улюбіўся ў гэтую прыгажосць і быў гатовы ахвяраваць яе кожнаму ахвотнаму. Нават бонус мне прапанаваў. "Калі ўмееце, — кажа, — дык на аргане можаце пайграць!" Божухна, як мне няёмка стала ад няўмення. Нават сыны паглядзелі на мяне расчаравана. Маўляў, ну што ж ты, бацька! Перачытаў тое, што напісаў і ўздыхнуў глыбока. Перажываю...

СВАЁ-МАЁ КРЭВА

Сюжэт для наступнага вітража надзвычай важны для разумення таго, што мы называем спадчынай. Гадоў трыццаць таму я і сыны падабралі з крэўскага замкавага друзу кавалачак цэглы і вельмі ўрачыста прывезлі дахаты частку беларускай даўніны. Дзвіз акцыі быў наступным: "У кожнага павінна быць сваё Крэва!" "На ўсіх не хопіць, — ахаладзіў нас знаёмы знаўца гісторыі. Аднак адначасова і абнадзеіў: — Рэшткі рымскага Калізея разбіраць на сувеніры забаронена. Але штоноча самазвалам прывозяць сюды тоны друзу. За дзень турысты яго разбіраюць. Працэс паўтараецца і не з'яўляецца для ўсіх сакрэтам. Правілы гульні строга захоўваюцца".

Вельмі арыгінальны маркетынгавы ход. Калі спадчына — святая, святым становіцца нават друз. Так што час цяпер збіраць камяні. Гэта ад нас залежыць, каб кожны з іх стаў святым.

СОЖ, СВІСЛАЧ, НЁМАН...

Гэта штосьці ды азначае, што нарадзіўся я ў горадзе з назвай жаночага роду і вырас на рацэ з найменнем роду мужчынскага. І якая карысць ці шкода ад таго, што жыву я цяпер у Мінску на Свіслачы. Напэўна, уся родавая мешанка нейкім чынам уплывае на свядомасць. Гэта як рэінкарнацыя пры жыцці. І ўсё дзеля таго, каб адчуць, зразумець Беларусь.

Мой Сцяпан цяпер на Нёмане. Патэлефанаваў, што славіў двухкілаграмовага соміка. Пазнаёміўся і адпусціў: малы яшчэ сомік, няхай вылюднее. Так што ў Нёмане мой сын мае не абыякую знаёмую рыбіну.

Вось такі вітраж атрымаўся. З залатой лускай. Цяпер — ваша чарга.

ЯРКІ КОЛЕР СЯРЭДНЯВЕЧЧА

"На Замкавай вуліцы рыцары ды вершнікі зліліся з месцічамі і накіраваліся да рэзідэнцыі Сапегаў..." Чуеце бразгат зброі, людскі гоман ды пошчак конскіх капытоў? Менавіта так Аліна Санюк апісала пачатак адзінаццатага фестывалю сярэднявечнай музыкі і культуры, што прайшоў ля сцен **Гальшанскага** замка. Так апісала, ажно я пашкадаваў, што не вырваўся да старадаўніх мароў, не пасварыўся з рыцарамі ды не пакаштаваў славутых пернікаў.

А вось адзінаццаты рэгіянальны фэст народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў "Дрыбінскія таржкі" сёння толькі анансуецца. Пройдзе ён 19, 20 жніўня. У першы дзень рэй будуць весці дзіцячае ды маладзёжнае свята. Можна паўдзельнічаць у конкурсе малюнка на асфальце, паэтычным батле і харэаграфічным флэш-мобе, паспрабаваць сілы ў нанясенні часовых татушак, наведаць маладзёжную дыскатэку. На наступны дзень гасцямі фэсту стануць майстры ды рамеснікі. Ахвотных чакаюць майстар-класы, народныя гульні, выстава рэтра-аўтамабіляў, канцэрт салістаў раённага цэнтра культуры. Лета яшчэ не скончылася, таму краіна фестываляў на поўную моц.

ПАД КНІЖНЫМІ ВЕТРАЗЯМІ

Нізка навін ад Вольгі Заянчкоўскай, бібліятэкара **Астравецкай** раённай бібліятэкі. Першая. Супрацоўнікі названай установы наведалі летнік "Ластаўка" і прапанавалі яго выхаванцам паўдзельнічаць у літаратурных гонках "Пад кніжным ветразем". Дзень быў запоўнены літаратурнымі эстафетамі, інтэлектуальнымі спаборніцтвамі. Лепшыя чытачы атрымалі салодкія падарункі. Мо так і трэба з дзіцячай аўдыторыяй? Любіш кніжкі — трымай цукерку!

Другая. А сярод выхаванцаў летніка "Брыгаціна" школы №3 райбібліятэка правяла акцыю "Лета нашых усмешак". Гэта было свята добрага настрою, які дапамаглі стварыць вясёлыя дзіцячыя кнігі.

Трэцяя. На вёсцы чытачы таксама не сумавалі. У **Міхалішкаўскай** сельскай бібліятэцы з'явілася казачная гераіня Весялінка і прапанавала знайсці маркі клад. Клад, натуральна, таксама быў салодкім.

ГЕРОЙ СВЯТА — СУСЕД

Пра Дзень суседа напісала Ганна Давідовіч з аграгарадка **Кракоўка Ашмянская** раёна. *"У аграгарадку — 19 вуліц, — распавядае аўтарка. — Жыхары Камсамольскай ды Інтэрнацыянальнай ажыццявілі такім чынам сваю даўнюю мару. Вынеслі на двор крэслы, сталы, утварылі вулічную глядзельную залу. А насупраць сцэну. Спачатку дзеці выступілі, потым — дарослыя".*

ПА ВАГОНАХ, ЧЫТАЧЫ!

З інфармацыйна-бібліятэчнага аддзела **Гродзенскага** раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра паведамляюць пра бібліятэчны вагон "Прысядзем на дарожку". Справа ў тым, што ў аграгарадку Парэччы бібліятэкар Алена Санюк разам з азёрскай каляжанкай Інэсай Васілевіч "пабудавалі" вагон, дзе афармілі кніжную выставу чытацкіх пераваг, прапанавалі кніжкі для розных узростаў. Намалявалі вакзал і падрыхтавалі фотазону.

ТРЫ ЖАДАННІ

У дзень зажынак аддзячваюць зямлі механізатары, жнейкі, салісты народнага ансамбля народнай песні "Берастаўбіцкія музыкі" і народнага ансамбля польскай песні "Стакроткі". І першы сноп падкідваецца так высока, каб удзельнікі жніва паспелі загадаць жаданні. Пасля гэтага і страт не будзе, і тэхніка не падвядзе, ім здароўя ўсім хопіць давесці хлебаробскую справу да дажынак.

Беражыце сябе, шаноўныя, і пішыце пра цікавае!

Сустрэнемся праз тыдзень.

Яўген РАГІН

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

"Люлечка"

Як Люлечка ў моры купалася

Відэакліпы — прыступка ўдасканалення народнага гурта

Давайце спачатку з назвай разбяромся. У асобных паселішчах Магілёўшчыны ды Гомельшчыны "люлькай" называлі калыску. Менавіта гэтая дэфініцыя і маецца на ўвазе, калі гаворка заходзіць пра народны ансамбль народнай песні і музыкі "Люлечка", які дзейнічае пры Асіповіцкім раённым цэнтры культуры.

Асіповіччына мяне заўжды здзіўляла надзвычай старанным падыходам да развіцця рэгіянальнай культуры. Спачатку я знаёміўся з бібліятэчнай сістэмай. Нават пры самым бліжэйшым разглядзе, расцягнутым на некалькі гадоў, ніякіх шурпатасцей не заўважыў. Спрэс крэатыў і строгае захаванне працоўнай дысцыпліны. Тое ж магу сказаць і пра клубную дзейнасць.

КАЛІ Б НЕ АНДРУШКЕВІЧ...

Звярнуць увагу на "Люлечку" параіла кіраўнік раённай культуры Ірына Раманчук. І не столькі мо на "Люлечку", колькі на яе сённяшняга кіраўніка Наталлю Андрушкевіч. Маўляў, калі б не яна, напэўна, і асаблівай нагоды пісаць пра калектыў не было б. Пачаў разбірацца ў пытанні і зразумеў: усё правільна.

Калектыў быў створаны ў 1988 годзе Людмілай Грынько, пад яе кіраўніцтвам стаў народным. Вольга Давідовіч узначаліла гурт у 1998 годзе. Ён быў цалкам абноўлены. Звычайная дыялектыка развіцця. З 2005-га кіраваць "Люлечкай" стала Наталля Андрушкевіч, якая з першых дзён абноўленага складу была ў калектыве канцэртмайстрам, прафесійна валодае ігрой на баяне, скончыла ССМШ пры БДК і мінскае музычнае вучылішча па класе баяна.

Скончыла яна і Універсітэт культуры і мастацтваў, дзе займалася на кафедры народна-песеннай творчасці. У сям'і Наталлі спявалі ўсе. Гітара і гармонік былі рэчамі звычайнымі і блізкімі, таму ці не кожная сямейная вечарына пераўтваралася ў тэатральна-канцэртную дзею.

ПАД ЛЯ-ЛЯ-ЛЯ

Вось што згадвае сама спадарыня Наталля: "Любоў да песні ў мяне — ад мамы і бабулі, якая пад ля-ля-ля вучыла падбіраць па слыху полькі, вальсы, любімыя ў сям'і народныя песні." Многія з іх увайшлі ў рэпертуар калектыву. Цяпер у ім больш за 40 песень і танцаў. Рэпертуар пастаянна абнаўляецца і ўдасканальваецца.

Паказальна і тое, што з першых дзён абноўленага складу супрацоўнічаюць з калектывам сапраўдныя самародкі, якія маюць і вакальныя дадзеныя, і музычны слых з рытмам.

ЯНЫ ЎМЕЮЦЬ УСЁ

Сваіх калег Наталля Андрушкевіч бязмежна любіць і паважае. "Святлана Якавіцкая з маленства чула народныя інструменты, бо дзядуля-самавук граў на скрыпцы, а бацька — на гармоніку і цымбалах. Сяргей Бабіна — выканаўца вакальных партый, удзельнік многіх гумарыстычных пастановак. Наталля Гоцына асвоіла беларускую дудку, цудоўная вядучая. Вольга Мядзведзева і Вольга Аліферовіч — шыкоўныя спявачкі.

І сярод моладзі хапае небуякавых і таленавітых, якія ўмеюць усё, прынамсі, вучацца гэта рабіць. Сярод іх — Мікалай Мядзведзеў, Вольга Бусел, Ірына Барташ, Наталля Аташонак, Аляксандр Чыстоў, Юрый Каржоў ды Марына Бундзіна".

ПЕРШЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

А цяпер пра тое, што мяне вельмі здзівіла. Гурт "Люлечка" стаў першым самадзейным калектывам краіны, які стварыў музычныя відэакліпы да песень "Купалася Кася ў моры" (2015) і "Ой, там за гарамі" (2021). У РЦК шмат прафесійных спецыялістаў, якія пайшлі насустрач. Што атрымалася, змешчана ў сацыяльных сетках і карыстаецца павышаным попытам. Глядзяць, натуральна, калегі, цікавяцца, неаспрэчна, аматары фолк-музыкі.

Гэтыя кліпы — рэклама? Неаспрэчна! Ды гэта, па цвёрдым перакананні спадарыні Наталлі, яшчэ і значны крок наперад у развіцці калектыву. Спроба сіл не толькі ў справе музычнай ды вакальнай, але і артыстычнай. А гэта для самадзейнага артыста таксама выключна важна.

НАША ПЕСНЯ — НА ЭКСПАРТ

"Люлечка" паспела пабываць з гастролямі ў Расіі, Польшчы, Венгрыі, Чэхіі, Славакіі, Харватыі. Пабываў калектыў на дваццатым міжнародным фестывалі фальклору і традыцыйнай культуры ў Махачкале (Дагестан), дзе таксама пакінуў пасля сябе самыя цудоўныя ўражанні. Словам, да гастролей "Люлечка" прызвычаілася. Так што спіс канцэртных вандровак будзе доўжыцца.

Натуральна, у мяне ўзнікла пытанне: а за які кошт калектыў і кліпы здымаў, і за мяжу выпраўляўся? За свой! І такі адказ не надта здзівіў. Калі б не ініцыятыва Андрушкевіч, мо я і не пісаў бы пра "Люлечку".

Але неаспрэчным застаецца вось што: прафесійны гонар і энтузіязм для нашых работнікаў культуры — сінонімы. Гэтыя людзі — самадастатковыя. Ёсць грошы — цудоўна. Няма — плакаць не будуць, а справу сваю ў любым выпадку выканаюць. І кліп здымуць, і на гастролі выправяцца. На вялікі жаль, не пра ўсе такія творчыя калектывы мы ведаем.

Яўген РАГІН

Дзе атрымліваюць мядовую адукацыю

Сёння, 13 жніўня, адбываецца тэатралізаванае свята "Граўжышкоўскі мядовы кірмаш". Вельмі шмат тут ліпы расце, таму ў наваколлі спрадвек шмат пчаляроў.

Сёлета гасцей чакаюць: тэатралізаванае прадстаўленне "Слава, слава пчалярам!", канцэрты найлепшых творчых калектываў і выканаўцаў раёна; гандлёвыя рады ад мясцовых і прыезджых пчаляроў з выставай-продажам мёду і прадуктаў пчалярства.

Адзін з самых вясёлых смачных конкурсаў — "Мядовыя блінаеды". А таксама свята дасць магчымасць займецца... мядовую адукацыю: кожны ахвотны атрымае патрэбную кансультацыю.

Вацлаў СІДАРОВІЧ,
загадчык аддзела культуры і волынага часу аграгарадка Граўжышкі

Збяруцца сыравары

20 жніўня ў аграгарадку Жупраны адбудзецца свята "Вясковыя сыравары", бо мясцовыя кулінары славяцца майстэрствам сыраробства і толькі раз на год — у свята сыру — гатовыя падзяліцца з гасцямі сваімі рэцэптамі.

А рэцэптаў шмат, бо сыры бываюць цвёрдыя і мяккія, салодкія і салёныя, плаўленыя і творожныя, сулугуні і брынза, сырніцы і сырныя аладкі.... Разначка сырнага свята — кірмаш-продаж прадукцыі з яе дэгустацыяй.

Акрамя таго, чакаюцца і майстар-класы. А яшчэ работнікі культуры падрыхтавалі для ўдзельнікаў вялікі канцэрт.

Дыяна БЕНЕДЗІСЮК,
загадчык аддзела культуры і волынага часу аграгарадка Жупраны

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

КУЛЬТУРА / KIMPRESS.BY
№ 33 / 13 ЖНІЎНЯ 2022 г.

13 жніўня 2022 года — дзень памяці Якуба Коласа, класіка беларускай літаратуры, выдатнага настаўніка і педагога, таленавітага навукоўца, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча. Яго жыццёваму і творчаму шляху прысвечана вялікая колькасць артыкулаў і публікацый, кніг і манаграфій, даследаванняў і дысертацый.

Якуб Колас у прэзідыуме гарадскога вечара, прысвечанага 70-годдзю з дня яго нараджэння. Злева ад класіка сядзіць Міхаіл Ісакоўскі. Мінск, 15.11.1952 г.

На памяць ад класіка

Да 130-годдзя з дня нараджэння паэта быў выдадзены поўны збор яго твораў у дваццаці тамах. Здаецца, знайсці нешта новае, невядомае амаль немагчыма. Але знаходкі часам радуюць коласазнаўцаў і прыхільнікаў творчасці беларускага песняра, што асабліва прыемна ў юбілейны год, калі ў Беларусі шырока адзначаецца 140-годдзе з дня нараджэння Якуба Коласа. Адной з такіх знаходак парадуем чытачоў "Культуры".

На працягу года ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа ажыццяўляецца праект "Ад усяго сэрца, ад усёй душы" па дарчых надпісах, інскрыптах Якуба Коласа на кнігах, які атрымаў падтрымку гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у сферы культуры. Зварот да кніг з дарчымі надпісамі невыпадковы, бо кожная з іх з'яўляецца ўнікальнай, адзінай у сваім родзе, памятае цеплыню рук свайго аўтара і захоўвае яго рукапісны аўтограф. Разам з тым гэта твор, якім хацеў падзяліцца класік беларускай літаратуры са сваімі сябрамі і знаёмымі. Кнігі з аўтографамі яскрава характарызуюць акружэнне беларускага песняра. Сярод шчаслівых уладальнікаў кніг з аўтографамі Якуба Коласа — яго родныя і блізкія, сябры, пісьменнікі, навукоўцы, дактары, дзяржаўныя і грамадскія дзеячы, а таксама перакладчыкі.

Якуб Колас быў добра знаёмы з многімі перакладчыкамі сваіх твораў. Сяброўскія адносіны, часам поўныя папрокаў, горычы і расчаравання, склаліся ў беларускага паэта з пачынальнікам акмеізму, вядомым рускім паэтам і перакладчыкам Сяргеем Мітрафанавічам Гарадзецкім. Тэме іх няпростых стасункаў прысвечаны шэраг публікацый. Аднак быў і яшчэ адзін перакладчык — Міхаіл Васільевіч Ісакоўскі, яго сяброўства з Якубам Коласам таксама было не заўсёды шчырым...

ПЕРШАЕ ЗНАЁМСТВА

З паэтам Міхаілам Ісакоўскім Якуб Колас пазнаёміўся ў 1934 годзе. Ісакоўскі быў родам са Смаленшчыны. Пачатак яго творчага шляху адносіцца да 1914 года, калі ў друку выйшаў верш "Просьба солдата". Яго першы паэтычны зборнік "Провода в соломе" пабачыў свет у 1927 годзе. Ён падвергся жорсткай крытыцы з боку вядомага літаратуразнаўцы Абрама Ляжнёва. Аднак за надаранні паэта заступіўся Максім Горкі. "*Михаил Исаковский,* — пісаў Горкі, — *не деревенский, а тот новый человек, который знает, что город и деревня — две силы, которые отдельно одна от другой существовать не могут, и знает, что для них пришла пора слиться в одну необоримую творческую силу...*".

Інскрыпт Ісакоўскаму

Ісакоўскі атрымаў папулярнасць дзякуючы вершам, якія былі пакладзены на музыку, сярод іх шырока вядомыя песні "Кацюша", "Каким ты был, таким ты и остался", "Ой, цветёт калина" і інш.

Міхаіл Ісакоўскі быў рэдактарам зборніка вершаў беларускага паэта "Избранные стихи", які выйшаў на рускай мове ў 1935 годзе. Паэзія Коласа ўразіла Ісакоўскага сваёй дакладнасцю, без дакладнасці "не может быть подлинного искусства и большой поэзии" — сцвярджаў перакладчык. Вершы беларускага песняра, па меркаванні Ісакоўскага, былі напісаны простаю моваю, зразумелай кожнаму беларусу, але за знешняй прастатою былі схаваны хыццёвая мудрасць і глыбіня думкі.

Аб сустрэчах з Коласам Ісакоўскі пісаў: "*Я не раз встречался с Константином Михайловичем, он бывал у меня в гостях с группой белорусских писателей, бывал и я в Минске, в доме Коласа — радушного, хлебосольного хозяина*".

Паэтычныя здольнасці і талент Міхаіла Ісакоўскага Якуб Колас ацэньваў даволі высока, аб гэтым сведчаць хаця б радзі з яго ліста да Люцыі Багдановіч, школьніцы з Лепеля, якая даслала на суд пісьменніка свой верш: "*Думаю, што ты можаш складаць вершы, але для гэтага трэба многа вучыцца, многа працаваць, многа чытаць — нашых класікаў і лепшых савецкіх паэтаў: Твардоўскага, Ісакоўскага, Сіманава і другіх*". Колас ставіў Ісакоўскага ў шэраг найлепшых паэтаў свайго часу.

Міхаіл Ісакоўскі пераклаў на рускую мову многа вершаў Якуба Коласа, сярод якіх "Адлёт жураўлёў", "Мужык", "Водгулле", "Покліч", "Ноч", "Песня аб вясне" і іншыя, чатыры раздзелы паэмы "Новая зямля". Збіраўся перакласці і вялікі ўрывак з паэмы "Сымон-музыка" паплам з Барысам Ірыніным. Але здзейсніць творчыя планы не атрымалася. Ірынін успамінаў: "Абставіны склаліся так, што М.В. Ісакоўскі не мог перакласці сваёй часткі, і я па яго просьбе ўзяў усю работу на сябе".

Міхаіл Ісакоўскі быў адным з рэдактараў збору твораў Якуба Коласа ў чатырох тамах, які выйшаў у Маскве ў 1951—1952 гадах да юбілею беларускага песняра. Пад яго рэдакцыяй павінна была выйсці паэма "Рыбакова хата" ў перакладзе на рускую мову Барыса Ірыніна і Пятра Сямяніна. Аб такім рашэнні Праўлення Саюза пісьменнікаў БССР было напісана ў газеце "Літаратура і мастацтва" за 6 верасня 1947 года. У лісце да Міхася і Соф'і Лыньковых ад 11 кастрычніка 1947 года Якуб Колас пісаў: "*Ісакоўскі выехаў у Гагры і адмовіўся ўзначальваць пераклад «Рыбаковай хаты»*". Пераклад паэмы ажыццявілі Гарадзецкі, Ірынін і Сямянін. Кніга выйшла ў 1949 годзе пад рэдакцыяй М.К.Чукоўскага.

Сустракаліся паэты 15 лістапада 1952 года, у тэатры Оперы і балета ўрачыста адзначалі сямідзесяцігоддзе Якуба Коласа. Сярод гасцей з Масквы быў і Міхаіл Васільевіч Ісакоўскі. А 29 лістапада прайшоў юбілейны вечар беларускага песняра ў Маскве ў Цэнтральным Доме літаратара, дзе Міхаіл Ісакоўскі выступіў з прывітальным словам.

НЯШЧЫРАЕ СЯБРОЎСТВА

У 1937 годзе Міхаіл Ісакоўскі працаваў над перакладам кнігі выбраных твораў Якуба Коласа, якую рыхтавала да друку выдавецтва "Мастацкая літаратура". Адзін з вершаў насцярожыў перакладчыка. Не разабраўшыся да канца, ён піша ліст старшыні Саюза пісьменнікаў СССР Уладзіміру Стаўскаму: "*Дорогой Владимир Петрович! Среди полученных мною стихов было одно под названием "Полымя". Это стихотворение имело подзаголовок "Вместо приветствия к 5-й годовщине". Вначале я не обратил на это стихотворение особого внимания, полагая, что оно посвящено журналу "Полыми революции". Но через некоторое время увидел, что дата написания стихотворения — 1926 г., и понял, что пятилетия журнала в этом году быть не могло, т.к., насколько мне известно, издание журнала "Полыми революции" началось значительно позже.*

Не будучи хорошо осведомленным в белорусских делах, я начал по разным источникам наводить справки о "Полыме". Причём выяснилось, что "Полымя" — это контрреволюционная нацдемовская организация, которая была в своё время разоблачена. И этой организации Якуб Колас посвящает стихи, включая их в книгу в 1937 году!" Ісакоўскі прасіў разабрацца і прыняць неабходныя меры. Даследчыкі Людміла Селіцкая і Дзмітрый Васіляўскі ў артыкуле "Поэт Исковский доносил на Якуба Коласа" дэталёва разглядзелі шлях даносу на класіка беларускай літаратуры, які трапіў ад Уладзіміра Стаўскага да кіраўніка камуністычнай партыі Беларусі Васіля Шаранговіча, а затым да старшыні Саюза пісьменнікаў БССР Міхася Лынькова. Дакладна невядома, але, хутчэй за ўсё, у справе разабраліся. Контррэвалюцыйная арганізацыя "Полымя", якая так напалохала Ісакоўскага, была створана ў снежні 1927 года, а верш, які выклікаў столькі непаразуменняў, Колас напісаў раней, у 1926-м. Часопіс "Полымя", які спачатку выходзіў пад назвай "Полымя рэвалюцыі", і сапраўды пачаў выходзіць у 1922 годзе, менавіта 5-й гадавіне яго выхаду ў друку і прысвяціў свой верш класік беларускай літаратуры. Ды і падборкай вершаў для зборніка займаўся не Колас. У лісце да перакладчыка Яўгена Мазалькова ад 14 студзеня 1936 года паэт пісаў: "*Вообще же своим сборником я не совсем удовлетворён. Во-первых, выборку стихов делал не я лично — поручил одному своему знакомому, поверил ему. Подбор можно было бы сделать более удачный. К сожалению, не имел возможности сделать это. Переводы тоже не все сделаны аккуратно. Большинство переводчиков, кроме Исаковского, отнеслось к переводу недостаточно внимательно. Я уехал на конгресс и не просмотрел переводов*".

У той нялёгкі час ілжывых абвінавачанняў і масавых расстрэлаў лёс класіка беларускай літаратуры мог скласціся па-іншаму. Сярод беларускіх пісьменнікаў па колькасці даносаў на іх Якуб Колас займаў другое месца — пасля свайго сябра і паплечніка Янкі Купалы.

СКЛАДАНАЯ ПРАЦА ПЕРАКЛАДЧЫКА

У 1945 годзе Якуб Колас пісаў Ісакоўскаму: "*Дорогой Михаил Васильевич! Очень жалею, что в мой кратковременный визит в Москву мне не удалось встретиться с Вами. Об этой встрече я думал в Минске. Я хотел поговорить с Вами о переводе моей поэмы "Новая земля". Хочу Вас просить взять на себя труд по переводу непереведенной части поэмы — часть её перевел С. Городецкий. Мне хотелось бы, чтобы Вы вместе с Сергеем Митрофановичем довели дело перевода до конца*".

Паэма "Новая зямля" была асабліва блізкай сэрцу перакладчыка, Міхаіл Ісакоўскі ўспамінаў: "*Меня всегда поражало то, что мысль Коласа звучит в стихе, воспринимается как народная. Так, например, самое моё любимое произведение у Коласа — поэму "Новая земля" справедливо называют на родине поэта энциклопедией народной жизни... Мне довелось переводить некоторые главы этой поэмы, и я вспоминаю, как не переставал удивляться достоверности, с которой сочно, я бы сказал, даже вкусно передавал Колас черты быта и духовного мира белорусской деревни тех далёких лет*".

Відавочна пераклад паэмы пачаў рухацца вельмі хутка. Праз два месяцы Якуб Колас напіша Ісакоўскаму: "*Меня очень порадовало Ваше желание одному перевести на русский язык мою поэму "Новая земля". Тот факт, что Вы сейчас переводите почти половину, а может быть и больше половины поэмы, говорит за то, что в недалёком будущем Вы переведёте и вторую часть поэмы, чему я буду весьма рад. Выписанные Вами слова и выражения, требующие некоторого авторского пояснения, свидетельствуют о всей серьёзности, с какой Вы приступаете к работе*".

Нягледзячы на дапамогу аўтара ў тлумачэнні выразаў і незразумелых слоў, складанасці з перакладам "Новай зямлі" ўсё ж такі былі. Міхаіл Ісакоўскі пісаў: "*Казалось бы, родственная близость белорусского и русского языков должна была во многом облегчить мою задачу переводчика, однако переводить было порой нелегко — хотелось сохранить во всей первозданной прелести и земную плоть стиха Коласа, и его тонкую поэтичность. Здесь постоянно был нужен поиск, порой окольный путь, точное угадывание граней, на которых преломлялась поэтичность двух языков*".

Ісакоўскі збіраўся перакласці на рускую мову паэму Якуба Коласа цалкам, але жыццёвыя абставіны перашкодзілі яму зрабіць гэта. "Новая зямля" выйшла ў перакладзе групы перакладчыкаў, сярод якіх быў не толькі Міхаіл Ісакоўскі, але і Сяргей Гарадзецкі, Павел Радзімаў, Пётр Сямынін, Яўген Мазалькоў. Праца над перакладам зацягнулася, у перакладзе на рускую мову паэма выйшла толькі ў 1949 годзе. Гэта часткова тлумачыцца жаданнем аўтара пераглядзець пераклады і ліквідаваць недахопы і недакладнасці. Сяргей Гарадзецкі спачатку негатыўна ўспрыняў такое жаданне Якуба Коласа. Каб заспакоіць свайго сябра, Колас пісаў: "*Но этому пересмотру подвергались и переводы Исаковского, кстати сказать, самые лучшие*". Успрыняўшы важкія аргументы беларускага пісьменніка, Гарадзецкі актыўна ўключыўся ў працу па ўдасканаленні свайго перакладу асобных раздзелаў "Новай зямлі".

НЕВЯДОМЫ ІНСКРЫПТ КЛАСІКА

Падзякай Ісакоўскаму за якасны пераклад стаў асобнік "Новай зямлі". Кніга выйшла ў друку ў Мінску ў 1949 годзе. На яе тытульнай старонцы Якуб Колас пакінуў наступны дарчы надпіс: **"Дорогому Михаилу Васильевичу Исаковскому, прекрасному поэту и человеку. Якуб Колас. 14. XII 1949 г."** Аўтограф друкуецца ўпершыню.

З 6 па 27 снежня класік беларускай літаратуры знаходзіўся ў Маскве, удзельнічаў у рабоце Камітэта па Сталінскіх прэміях. Падчас візіту ў сталіцу і была падараваная кніга. Рарытэтнае выданне захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва ў Маскве.

Паэма "Новая зямля" на рускай мове выйшла з пэўнымі скарачэннямі і купюрамі. У поўным зборы твораў Якуба Коласа адзначаецца, што "*купюры были зроблены ў тых раздзелах, дзе, на думку перакладчыкаў, Колас ідэалізаваў уласніка, не асуджаў памкненні героя да ўласнай зямлі. Пэўныя скарачэнні, і нават скажэнні, мелі месца ў апісанні рэлігійных свят, побытавых сцэн і пейзажных замалёвак*". Якуб Колас марыў, каб "Новая зямля" выйшла ў друку ў Маскве і чытачы з усяго Савецкага саюза маглі пазнаёміцца з гэтым творам. На жаль, як пры жыцці паэта, так і пасля паэма "Новая зямля", якую аўтар называў асноўнай ва ўсёй сваёй паэтычнай творчасці, асобнай кнігай у поўным перакладзе на рускую мову выдадзена не была...

Васіліна МІЦКЕВІЧ,
галоўны захавальнік фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа

Кажуць, улетку тэатральнае жыццё згасае. Але па нашых назіраннях — кіпіць!
Доказ — рубрыка "Кантрамарка".
Дарэчы, ад звычайных квіткоў яна адрозніваецца тым, што кантрамарку не прадаюць у касе, а ўручаюць спецыяльна запрошаным гасцям.
У якасці заахвочвання або проста па знаёмстве.
Трымайце, паважаныя чытачы, нашу "Кантрамарку" і далучайцеся да размовы.

Шчаслівыя сямёркі: з флёрам цудаў і казкі

Сёння мы выпраўляемся ў Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча (г.Бабруйск), завочную экскурсію па якім правядзе Таццяна Мікалаеўна Мурманцава, кіраўнік літаратурна-драматургічнай часткі гэтай установы культуры.

— Цікава, з флёрам казкі і цудаў прайшло ў нас закрыццё 77-га тэатральнага сезона, — Таццяна Мікалаеўна адразу пералічвае разыначкі апошняй падзеі, потым нагадвае вялікую гісторыю тэатра: — Адлік сезонаў пачаўся ў далёкім шматпакутным 1944 годзе. Імя Дуніна-Марцінкевіча тэатр носіць з 1977-га (заўважаеце сімвалізм?). Як чалавек у такім паважаным узросце, так і тэатр набывае мудрасць і багаты досвед. Да таго ж асабліва лічба 77 сімвалізуе эмоцыі, магію, творчасць і ўнікальнасць.

ЗА ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ГУЧАННЕ

Цяжка аспрэчыць, што праца любога супрацоўніка тэатра — творчая: асаблівая атмасфера нікога не пакідае абыякавым. Разнастайных эмоцый у 77-м сезоне хапіла ўсім: і супрацоўнікам тэатра, і гледачам, дзеля якіх яны працуюць. Ужо на адкрыцці сезона прэм'ерны спектакль "Песя і Янко" (А.Шульман, Я.Карпінскі / рэжысёр Т.Дарагабед) прымусіў гледачоў суперажываць і шкадаваць, плакаць і спадзявацца, разважаць і асуджаць. Гэта лірычная драма тым больш знайшла водгук у бабруйскага гледача, што распавядае пра цыгана Янко і маладзенькую яўрэйку Песю, якія падчас вайны падарылі адно аднаму цяпло і каханне, надзею і жыццё. Прымеркаваны да 80-годдзя знішчэння Бабруйскага гета, адзначаны спецыяльным Прызам журы "За патрыятычнае гучанне спектакля" на анлайн-фестывалі "Смаленскі каўчэг", спектакль "Песя і Янко" заняў пачэснае месца ў рэпертуары тэатра.

УЗНАГАРОДЫ, ПРЭМ'ЕРЫ, ВЕЧАРЫНЫ

Адразу ж трэба адзначыць яшчэ адну ўзнагароду сезона — Прыз глядацкіх сімпатый Наталлі Кашпур за ролю ў спектаклі "Старая зайчыха" (М.Каляда / рэжысёр Л.Пакрэўская) на фестывалі "Самародак" у г. Нагінску.

Наступная прэм'ера, "Маленькія камедыі" па п'есах А.Чэхава "Мядзведзь" і "Прапанова", у пастаноўцы Таццяны Дарагабед была прымеркаваная да Міжнароднага дня тэатра і падарыла гледачам усмешкі і радасць, бесклапотны смех і хвілінку адпачынку ад паўсядзённасці.

Працягнула існаванне традыцыя, распачатая падчас каранавіруса: на малой сцэне, у камерным атачэнні, угрунтаваліся вечары паэзіі. У гэтым сезоне ўшанавалі памяць беларускага песняра Янкі Купалы, запрасіўшы гледачоў у гасцёўню дзядзькі Янкі і цёткі Уладзі.

Вельмі пашанцавала юным гледачам: яны радаваліся і смяяліся, спачувалі і перажывалі, марылі і разважалі разам з героямі казак "Папялушка", "Бураціна" і "Вярніце Аўгусціну!". Трэба адзначыць, што інсцэніроўкі да "Папялушкі" і "Бураціна" зрабілі рэжысёры Л.Пакрэўская і К.Таскаева адпаведна. Гісторыю лялек "Вярніце Аўгусціну!" цалкам стварылі нашы артысты: аўтар п'есы Андрэй Марахоўка і рэжысёр Маргарыта Марахоўка.

РАЗНАСТАІЛІ СЕЗОН 77

З поспехам разнастаілі 77-ы сезон гастрольныя канцэрты і спектаклі, якія таленавіта паказалі на бабруйскай сцэне ансамбль "Бяседа" і шоу "Аллюр", Купалаўскі і Коласаўскі, Магілёўскі і Гомельскі (драматычны і лялек), Палескі і нават Азербайджанскі тэатры. Гледачы мелі шчаслівую магчымасць атрымаць асалоду ад камедый і драм, фантасмагорый і монаспектакляў, казак і інтэрактываў.

ПРА КРЫЛАТЫХ ЛЮДЗЕЙ

У дзень закрыцця 77-га сезона, 21 ліпеня, атмасфера казкі і цудаў пранізала тэатр. Усе прысутныя апынуліся пад аховай "Сярэбраных крылаў", балады, напісанай бабруйчанінам Валерыем Аляксеевым. Словы Эйнштэйна гучаць лейтматывам спектакля: "Ёсць толькі два спосабы пражыць жыццё. Першы — быццам цудаў не існуе. Другі — быццам вакол адны цуды". А з гэтай пастаноўкай адбываюцца сапраўдныя дзівосы!

Сам Валерый Аляксееў, чалавек няпростага лёсу, сціпла зазначыў: "Цуд ужо ў тым, што на працягу 11-ці сезонаў гледачы ідуць на "Сярэбраныя крылы". Пэўна, гісторыя пра аднакрылага хлопчыка, які заўважыў сваё шчасце, не прайшоў міма, адгукнулася ў сэрцах бабруйчан: у гэтым сезоне тройчы гледачы мелі магчымасць адказаць сабе на пытанне: "Бабруйск — гэта горад, куды прыляцелі крылатыя людзі, або горад, адкуль яны адляцелі?" Для мяне галоўнай умовай было, каб усе стваральнікі спектакля былі мясцовымі людзьмі, закаханымі ў родны горад. І гэта здарылася: музыку напісалі ўдзельнікі бабруйскага гурта "Зямля каралевы Мод", паставіла п'есу бабруйскі рэжысёр Таццяна Дарагабед. А калі спектакль выткаць з любві і з любоўю, то і атрымаўся такі вынік: некалькі пар артыстаў ажаніліся падчас працы ў пастаноўцы. Гледачы таксама апісваюць цудоўныя здзяйсненні сваіх мар пасля прагляду "Сярэбраных крылаў".

ПЛАНУЕМ ЦІКАВОСТКІ

Праводзячы зноў паралель з чалавекам, можна сказаць, што тэатр таксама жыве і змагаецца, сумуе і радуецца, аналізуе мінулае і плануе будучыню. Наша жыццё — гэта 8 новых пастановак за сезон. Змаганне — стан пасляковідных абмежаванняў, калі давялося непакоіцца пра кожнага гледача. Мы сумуем, калі нешта не атрымалася, і радуемся, калі нашу працу заўважаюць. Цяпер робім працу над памылкамі сезона-77 і плануем цікавосткі сезона-78, падрыхтоўка да якога ўжо пачалася. Ключавым яго момантам з'явіцца правядзенне VIII Рэспубліканскага фестывалю нацыянальнай драматургіі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча. Захоўваючы традыцыі, плануючы будучыню, мы працуем з любоўю да гледача, без якога няма сэнсу існавання тэатра.

Таццяна МУРМАНЦАВА

"Аконца на ўсход сонца", "Чым багаты", "Сямён дзень", "Прыгоды Алеся ў Зюзіным лесе", "Калядная былічка", "Аповесць былога сучасным пяром" — гэта назвы толькі некаторых праграм, якімі штогод радуе гледачоў Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ансамбль танца, музыкі і песні "Белыя росы".

"Белыя росы" пакараюць Дубай

Аповесць былога сучасным пяром

У рэпертуары калектыву за 35 гадоў існавання, якія будуць адзначаць у канцы гэтага года, танцы, музыка і песні не толькі роднай Беларусі, але і многіх іншых краін і народаў. "Белыя росы" і яго кіраўнік Вера Іванаўна Войнава ў пастаянным пошуку, бо толькі так можна зацікавіць гледача і падтрымаць высокі ўзровень выканання многія гады.

ЛЮБОЎ

Сёння ў складзе ансамбля больш за 80 чалавек, якія аб'яднаныя ў тры цэхі — балетны, вакальны і аркестравы. Узрост удзельнікаў — ад 20 да 50 гадоў. Без любові да творчасці нельга ўтрымацца ў прафесіі доўга, дэманстраваць на сцэне прыклады высокамастацкай творчасці і прыцягваць да сябе нязменную ўвагу на працягу 35 гадоў.

У 1987 годзе пад кіраўніцтвам заслужанага работніка культуры Беларусі Яўгена Аляксандравіча Штопа быў створаны ансамбль, у склад якога ўвайшлі артысты, што прыехалі ў Гродна з розных куточкаў Савецкага Саюза. Тады ў калектыве было 30 чалавек.

Назва "Белыя росы" з'явілася не адразу. Спачатку адным з варыянтаў быў "Гарадзеі". Але перамаглі "Белыя росы", і гэта не толькі асацыяцыя геаграфічная — назва вёскі, якая цяпер стала адным з раёнаў Гродна і была праслаўленая ў аднайменным мастацкім фільме. Тут закладзеныя больш глыбокія панняці, звязаныя з уяўленнямі беларусаў аб чысціні духоўнай і фізічнай. Як расказвае рэпетытар ансамбля Вольга Мілюціна, якая працуе ў калектыве з дня яго стварэння, — гэта аб самай першай, чыстай, светлай расе, што выпадае ў пачатку дня, гэта аб самых глыбінных вытоках народнай творчасці, гэта тыя крыніцы, з якіх бярэ ідэі і натхненне калектыў "Белыя росы".

Без любові і павагі да гэтых крыніц не ззяла б творчая зорка ансамбля. Аб актыўнай пазіцыі гаворыць і такі факт: ужо праз год прайшлі першыя гастролі ў Казахстане, Украіне, Расіі. Хутка адбыліся выступленні ў Іспаніі. У 1992 годзе пачалося супрацоўніцтва з іспанскім канцэртным агенцтвам "Mira Spain". Выступленні ў Кітаі адбываюцца амаль кожны год. Усяго ў гастрольнай афішы "Белых пор" налічваецца больш за 15 краін. Так, на ЕХРО ў Дубаі сёлета ансамбль выступаў больш за дзесяць разоў з паўгадзіннымі праграмамі, складзенымі з беларускіх нумароў "Чым багаты", "Аповесць былога сучасным пяром", "Аконца на ўсход сонца", а таксама быў запрошаны на мясцовае тэлебачанне.

Аб'ездзілі "Белыя росы" і ўсю Беларусь. Выступаюць артысты на невялікіх сцэнах раённых дамоў культуры і на вялікіх сцэнах вялікіх гарадоў. І заўсёды з любоўю да сваёй справы і да гледача, з любоўю і павагай да нашай нацыянальнай спадчыны і да спадчыны многіх народаў свету. І як вынік, у 2005 годзе ансамбль танца, музыкі і песні "Белые росы" быў адзначаны Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва ў намінацыі "Харэаграфічнае мастацтва". У 2015-м ансамбль "Белыя росы" атрымаў званне "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь".

ВЕРА

Вера танцуе ўсё жыццё. Упершыню маленькая Верачка выйшла на сцэну ў чатыры гады і станцавала дзіцячы танец, вельмі модны ў той час, — "Кука-рэ-ку". Здольнасць дзяўчынкі да танца заўважылі яе бацькі, абое творчыя работнікі Дома культуры. Так пачаўся шлях Веры на сцэну.

Пасля была вучоба ў Мінскім культпрасветвучылішчы, праца па размеркаванні мастацкім кіраўніком Дома культуры ў Нарачы і Вілейскім раёне і прыезд у Гродна. Пачалася праца ў ансамблі "Белыя росы" і паралельна вучоба ў Інстытуце культуры.

Гродна і месца працы сталі лёсавызначальнымі для Веры Іванаўны, без якіх яна не ўяўляе сваё жыццё. А любай сцэнай стала пляцоўка Гродзенскай філармоніі, адрамантаваная, сучасная, родная, дзе рэгулярна выступаюць "Белыя росы" перад любімымі гродзенскімі гледачамі.

Як прызнаецца сама Вера Іванаўна, вяна перфекцыяністка і не ўяўляе штампаў на сцэне, таму пастаянна шукае новае. Быць цікавым гледачам, розным іх пакаленням можна толькі ў развіцці. Таму ўвесь час абнаўляецца рэпертуар, шукаюцца новыя формы, рухі, напевы, ствараюцца новыя касцюмы. Каб паставіць нацыянальны танец іншай краіны, вывучаюцца не толькі рухі, але і культурныя традыцыі, гісторыя гэтага народа. Аб інтэнсіўнасці працы калектыву гаворыць і такі факт — толькі для апошняга "Славянскага базару" ў Віцебску падрыхтавалі сем новых нумароў.

Кіраўніком ансамбля "Белыя росы" Вера Войнава стала ў 2003 годзе.

— Выбіралі кіраўніка з пяці кандыдатур на самым высокім ўзроўні, з кожным з нас асабіста размаўляў старшыня Гродзенскага аблвыканкама, — успамінае Вера Іванаўна. — Гэта быў вельмі складаны перыяд — з артысткі балета паднялася на кіраўнічую пазіцыю. Але гэты перыяд стаў часам новых творчых магчымасцей, якія трэба было выкарыстаць для развіцця і сябе, і калектыву.

Вера Іванаўна шукала не толькі новыя кірункі творчасці, яна шукала свае метады і прыёмы кіраўніка. Цяпер упэўненая, што добры вынік даюць патрабавальныя, але шчырыя, уважлівыя адносіны да кожнага члена калектыву, стварэнне атмасферы даверу і падтрымкі. Выклікі на дыван да кіраўніка — не метад Веры Іванаўны. А сама яна дае прыклад сваімі адносінамі да працы і патрабавальнасцю да сябе. Усміхаецца, калі ўспамінае, як некалькі гадоў таму сама выйшла на сцэну, бо абставіны так склаліся. І хвалявалася толькі за тое, каб не паказацца штучнай, са штучнай усмешкай, а гэтага ў мастацтве яна не церпіць.

Таму сама стала займацца і стварэннем касцюмаў. У кабінеце Веры Іванаўны адразу звяртаеш увагу на вялікую калекцыю лялек у нацыянальных строях і бібліятэку выданняў па гісторыі касцюма.

— Першыя лялькі з'явіліся пасля гастроляў у Іспаніі, і з кожным годам калекцыя папаўняецца, збіраю лялькі каля 15 гадоў, — расказвае Вера Іванаўна. — Сёння ў нашага калектыву багатая калекцыя розных нацыянальных касцюмаў, амаль да кожнай новай праграмы шыецца і новае адзенне. Касцюм з'яўляецца неад'емнай часткай паспяховага як танцавальнага, так і вакальнага нумара.

Вера Іванаўна творыць нароўні з загадчыцай мастацка-пастаноўчай часткай Кацярынай Горбач. Патрабавальная да кожнай дэталі. А ўвасобіць задумкі дапамагаюць выкладчыкі, майстры і навучэнцы Гродзенскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа бытавога абслугоўвання насельніцтва. Гэта супрацоўніцтва ідзе многія гады, якасць пашыву задавальняе калектыў.

А яшчэ музычная адукацыя (Вера Іванаўна скончыла музычную школу, сальфеджыа працягвала вывучаць у культпрасветвучылішчы) дапамагае ёй і ў рабоце над музычным суправаджэннем і нумарамі вакальнай і аркестравай груп ансамбля.

НАДЗЕЯ

Развіццё кожнага творчага калектыву — гэта планы і надзеі на новыя дасягненні. Без бачных гарызонтаў развіццё немагчымае. А "Белыя росы" набліжаюцца да прыгожай даты — 35-годдзя.

У планах — стварэнне новай праграмы "Казкі Беларусі". І гэта не толькі планы, гэта работа, якая ажыццяўляецца ўжо працяглы час і павінна завяршыцца выступленнем у Палацы Рэспублікі ў Мінску, якое запланавана на 2 снежня 2022 года.

— Канцэпцыя праграмы з'явілася не адразу, — расказвае Вера Іванаўна. — Доўга думала аб новай праграме, і азарэнне прыйшло ў сне. Убачыла прыгожую дзяўчыну ў прыгожым адзенні, з доўгай касой і яна прамовіла адно слова: "Казка". І тут закруцілася: так, казкі. Але як на сцэне адлюстраваць гэту ідэю? Каб нашы гледачы былі зацікаўленыя, паведамлю толькі адну дэталь: на сцэне будзе Яшчар, пра якога расказваецца ў беларускіх казках. А астатняе запрашаю ўбачыць самім. Скажу толькі адно: дабро перамагае не толькі ў казках і на сцэне, але і ў жыцці.

А яшчэ дададзім, што гэта будзе тэатралізаваная вакальна-харэаграфічная праграма ў суправаджэнні аркестравай групы ансамбля і камернага аркестра Гродзенскай капэлы.

У 2011 годзе ансамбль танца, музыкі і песні "Белыя росы" аддзяліўся ад Гродзенскай філармоніі і стаў самастойнай дзяржаўнай установай культуры. Калектыў мае добрую матэрыяльную базу плошчай больш за тысячу квадратных метраў, гуказапісвальную студыю. Але ёсць планы і на пашырэнне базы — для больш якасных умоў дзейнасці дзіцячай студыі "Белыя расінкі", створанай дзесяць гадоў таму. Таксама могуць з'явіцца новыя плошчы для захавання касцюмаў і рэквізіту.

У студыі "Белыя расінкі" ў некалькіх узроставых групах займаецца больш за 200 дзяцей. За гэты час створана многа пастановак і танцаў. Юныя "расінкі" нароўні з дарослымі ўдзельнічаюць у навагодніх мюзіклах для дзяцей і дарослых, выступаюць у канцэртных праграмах.

У жніўні адбудзецца паездка калектыву ў Разань на Міжнародны форум старажытных гарадоў, там пройдуць два сольныя канцэрты і ўдзел у гала-канцэрце.

І ўвогуле задум і надзей у ансамбля дастаткова. У рэпертуары больш за 20 харэаграфічных пастановак, танцы многіх народаў свету. Вакальны ансамбль выконвае пяцігалосыя творы на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, яўрэйскай, цыганскай, кітайскай, іспанскай, украінскай, грузінскай мовах. У Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь ансамбля танца, музыкі і песні "Белыя росы" вялікі творчы патэнцыял — а значыць, ёсць і вялікія планы, якія яны на працягу 35 гадоў ажыццяўляюць з любоўю, верай і надзеяй.

Надзея ВАШКЕЛЕВІЧ
Фота з архіва ансамбля "Белыя росы"

Скульптар-самавук з Аршаншчыны

19 жніўня (па старым стылі — 7 жніўня) — дзень памяці выдатнага беларускага творцы XIX стагоддзя, скульптара Яна Астроўскага. Працаваў ён пераважна ў малых формах — рабіў медальёны і бюсты. За два дзясяткі гадоў Астроўскі стварыў каля пяці дзясяткаў гіпсавых і бронзавых выяў вядомых гістарычных асоб і культурных дзеячаў Беларусі, Літвы і Польшчы, што разышліся па ўсім свеце ў выглядзе шматлікіх копій. Але, як ні парадаксальна, у беларускіх музеях і галерэях сёння не знайсці аніводнага твора майстры. Дый пра яго самога ведаюць лічаныя адзінкі.

Метрыка шлюбу Яна Астроўскага (з архіва аўтара)

Паэт Адам Міцкевіч, 1859
(Літоўскі нацыянальны мастацкі музей)

Паэт Уладыслаў Сыракомля, 1856 (Лазенкі, Варшава)

Паэт Юльян Корсак (Лазенкі, Варшава)

Надмагілле Яна Астроўскага на Росах

ДОЎГІ ШЛЯХ У МАСТАЦТВА

Нарадзіўся Ян Астроўскі каля 1811 года ў невялічкім старажытным мястэчку Сянно на Аршаншчыне. Нядаўна мы знайшлі новыя дакументы, дзякуючы якім удалося ўстанавіць імёны бацькоў скульптара: Станіслаў Астроўскі і Агата Казлоўская (каля 1776 — 1841), прадстаўнікі дробных беларускіх шляхецкіх родаў. Уся адукацыя будучага майстра — "элементарная школа" ў Жамойці, куды ён быў адпраўлены да сваякоў. Пэўна, пасля смерці бацькі, у пошуках лепшай долі Ян едзе ў Віцебск. У горадзе на Дзвіне жыў нейкі багаты сваяк Астроўскіх, на дапамогу якога разлічваў юнак. Але прахалодны прыём сваяка прымусіў Яна Астроўскага шукаць долі самастойна. Так хлопец на шэсць гадоў стаў віцебскім вазніцам. У 1834 годзе ён перабіраецца ў Вільню і на два гады ўладкоўваецца вартаўніком у пансіянат для дзяўчат, які трымала нейкая пані Герман. З марамі працягнуць адукацыю Астроўскаму прыйшлося развітацца раз і назаўжды. Бо Віленскі ўніверсітэт, славуты сваімі выкладчыкамі і вучнямі, ужо два гады як загадам царскіх уладаў быў закрыты. Кафедра ж скульптуры, да якой Астроўскі меў прыродную схільнасць, была скасаваная яшчэ ў 1826 годзе. Цяпер, каб вучыцца мастацтвам, беларуская моладзь мусіла ехаць за тысячы кіламетраў у Пецярбурскую акадэмію мастацтваў, што было дасяжным толькі лічаным адзінкам. Каля 1836 года жыццё Яна Астроўскага зрабіла чарговы зігзаг. Падчас віленскага кірмашу ён знаёміцца з французскім купцом з Рыгі, які прапанаваў Астроўскаму больш выгадную працу ў Рызе. Пэўны час Астроўскі працаваў вазніцам, а таксама разгружаў караблі з соллю. Адночы падчас разгрузкі з ім здараўся няшчасны выпадак, які прымусіў Яна Астроўскага назаўжды развітацца з цяжкай фізічнай працай. Набыўшы шарманку і вывучыўшы некалькі жанглёрскіх прыёмаў, быў вазніца адпраўляецца ў першае артыстычнае турнэ па Жамойці. У Кейданах ён знаёміцца з вандроўнымі італьянскімі майстрамі, якія за грошы пагадзіліся падзяліцца сакрэтамі свайго промыслу. А займаліся яны вырабам фігурак з гіпсу. Але першыя спробы сілаў на скульптурным фронце былі перакрываваныя царскім жандарам, які на кірмашы прычапіўся да пратэрмінаванага пашпарта аршанца і забраў у якасці штрафу найлепшыя фігуркі. Не прадаўшы аніводнай з тых, што засталіся, Ян вярнуўся да шарманкі, чым і займаўся наступныя тры гады, пакуль аднойчы не захварэў. Ды так моцна, што ні гаспадары пакойчыка, які ён наймаў, ні лекары, ні ксёндз не мелі ўжо і спадзеваў убачыць хлопца на нагах. Але кавалак гліны, што выпадкова трапіў у рукі Астроўскаму, літаральна вырваў таго з абдоймаў смерці.

ЦУДЫ ЗДАРАЮЦЦА

Працуючы над фігуркай "Збавіцеля", скульптар ачуняў, ды так хутка, ажно неўзабаве змог вырабіць яшчэ не адзін тузін "Збавіцеляў" на замову мясцовых жыхароў. Адчуўшы, што сілы вярнуліся, а яго творчасць падабаецца людзям, Ян Астроўскі вырашае ізноў радыкальна змяніць кірунак дзейнасці і перабіраецца ў Вільню. А яшчэ ён... жэніцца. Адбылося тое 11 (23) мая 1841 года ў віленскім касцёле Гары Збавіцеля. Абранніцай Астроўскага стала віленская шляхцянка Анэля (25 гадоў), дачка Ёахіма Кандратовіча і Петранэлі Юхневіч. Але неўзабаве, 22 ліпеня (2 жніўня), памерла хворая на сухоты старэнькая маці Яна Агата, якая жыла ў той час у Вільні, "на паплавах". Пахавалі яе на знакамітых могілках на Росах, непадалёк славутага "Літаратурнага пагорка", дзе знайшоў вечны супакой наш паэт Уладзіслаў Сыракомля, Іван Луцкевіч і многія іншыя беларускія дзеячы. Не так даўно яе надмагілле выявілі валанцёры, якія зрабілі інвентарную базу пахаванняў на Росах.

Ёсць меркаванне, што, апынуўшыся ў Вільні, малады скульптар пазнаёміўся з прадстаўнікамі віленскай скульптурнай школы — колішнім прафесарам Казімірам Ельскім (1782—1867) з Міншчыны і юрыстам па адукацыі Рафалам Слізенем (1804—1881) з Навагрудчыны. Абодва займаліся скульптурай дзеля забавы, вырабляючы бюсты і медальёны сваякоў, сяброў, розных вядомых дзеячаў. Астроўскі ж заняўся ёй прафесійна. І ў нейкі момант здарыўся другі цуд. У 1852 годзе памёр вядомы малады віленскі ксёндз Юстын Якубоўскі і яго сваякі замовілі Астроўскаму бюст памерлага. З пастаўленай задачай скульптар справіўся выдатна. Ад таго моманту і да самай смерці Ян Астроўскі займаўся толькі вырабам медальёнаў і бюстаў з гіпса або бронзы, абіраючы мадэлі, як і Слізень, сярод сучаснікаў і асоб, чыя слава прыйшлася на часы мінуўшчыны. Прыкладам, бюст Уладзіслава Сыракомлі, які Астроўскі вырабіў у 1854 годзе на замову Маўрыцыя Альгельбранта, заслужыў вельмі ўхвальную рэцэнзію ў СМІ. У 1858 годзе з'явілася чарговая публікацыя, у якой гаварылася пра жалобны стан мастацтва "ў Літве" (у сэнсе гістарычнай Літвы, не сённяшняй Летувы). Ян Астроўскі быў названы адзіным, хто заслугоўвае права звацца скульптарам, а яшчэ тым, хто ў сваёй творчасці "кіруецца хутчэй вялікім прыродным талентам, чым навыкамі адукацыі, якіх не атрымаў". Сярод яго прац аўтар публікацыі пералічыў бюсты віленскага губернатара Назімава (з бронзы, сёння захоўваецца ў "Дзяржаўным рускім музеі"), Тэадора Нарбута, Станіслава Манюшкі, Яўстаха Тышкевіча і інш. А былі яшчэ Тадэвуш Рэйтан, Юльян Нямцэвіч, Адам Міцкевіч, Тадэвуш Касцюшка і многія іншыя. У 1866 годзе адбылася і першая персанальная выстава майстра. Недзе ў гэты час атрымаў ён і заслужаную ўзнагароду ад Пецярбурскай акадэміі мастацтваў. Памёр Ян Астроўскі 7 (19) жніўня 1872 года "от горячки" і быў пахаваны на могілках Росы, побач з маці. Яго сціплае надмагілле з чорнага мармуру таксама захавалася. На камені, напалову засыпаным зямлёй, добра чытаецца: "Ян Астроўскі, скульптар Віленскі".

Як жа выглядаў Ян Астроўскі? На гэта пытанне адказу мы не знайшлі. Няма а ні фота, а ні малюнкаў з выявай старога скульптара. Ёсць згадка, што ім быў выраблены скульптурны аўтапартрэт. Захоўваўся ён у свой час у Кракаўскім нацыянальным музеі. Але нашы спробы атрымаць выяву бюста пакуль што поспеху не мелі.

Працягам гэтай публікацыі стане гісторыя двух Юзафаў Казлоўскіх, якія могуць даводзіцца Яну Астроўскаму далёкімі сваякамі. Адзін з іх быў славутым кампазітарам, а другі — скульптарам і разьбяром па камяні.

Зміцер ЮРКЕВІЧ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 397 01 63
(экскурсійнае бюро)

• **Пастаянныя экспазіцыі.**
• Выстава **"Плынь часу"** – творы беларускіх мастакоў-юбіляраў 2022 года. **Да 28 жніўня.**

• **"Пачуццяў светлых хараство"** – персанальная выстава **Віктара Барабанцава** да 75-годдзя мастака. **З 12 жніўня да 11 верасня.**

Выставачны корпус, вул. К. Маркса, 24

• **Персанальная выстава Мікалая Ісаёнка.** Да 75-годдзя мастака. Рэтраспектыва творчай спадчыны за 50 гадоў і новыя работы. **Да 28 жніўня.**

• Выставачны праект **"Жаночы Род". Да 1 кастрычніка.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл. 8 (0222) 65 07 57, 65 88 00

• **Пастаянныя экспазіцыі**.
• Выстава **"Мора. Неба. Аблокі"**, прысвечаная адлюстраванню ў беларускім мастацтве XX стагоддзя прыродных з'яў і разнастайных форм адпачынку чалавека на прыродзе ў розныя поры года. **Да 2 кастрычніка.**

• Праграма **Art-lectorium "Зразумелае мастацтва". Праводзіцца заўсёды.** Падрабязней на сайце музея (artmuseum.by) альбо па тэлефонах: 8 (0222) 65 02 03, 65 88 00.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3. Тэл.: 399-09-78

• Выставачны праект **"Сальвадор Далі. Святое пасланне"**: графічная серыя вялікага мастака XX стагоддзя – **яго ілюстрацыі да Старога і Новага Запаветаў з прыватнага збору. Да 14 жніўня.**
• Персанальная выстава **Валянціна Нуднова "Цела Вады". З 17 жніўня да 25 верасня.**
• Выстава **"Марк Шагал: мастацтва бачыць свет сэрцам"**. Да 135-годдзя мастака. Дэманструюцца работы сучасных аўтараў, якія інтэрпрэтуюць, цытуюць і пераасэнсоўваюць спадчыну Марка Шагала. **Да 21 жніўня.**
• Віртуальны праект **"Адзіная спадчына"**. Даступны на сайце ncsm.by. **Да 31 снежня.**
• Майстар-класы для школьнікаў: **"Акварэльныя замалёўкі", "Начны пейзаж", "Вясновыя фантазіі", "Што пабачылі мае вочы…"**. Для груп ад 5 чалавек па папярэднім запісе.

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47. Тэл.: 242-78-14

• Выставачны праект **"Шагал. La Bible". Да 28 жніўня.**

УНП 192543414

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл. +375 (17) 203 07 92, +375 (29) 144 07 92, +375 (17) 327 11 66

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Часовая экспазіцыя **"Партызанскія кіраўнікі Беларусі"**. Дэманструюцца фотаздымкі, дакументы, асабістыя рэчы і творы выяўленчага мастацтва. **Да 5 верасня.**
• Часовая экспазіцыя **"Бог вайны"**, прымеркаваная да 80-годдзя пачатку Сталінградскай бітвы і 78-годдзя зацвярджэння Дня ракетных войск і артылерыі. **Да 15 жніўня.**
• Выставачны праект **"Вызваленне Еўропы" ў рамках Міжнароднага праекта "Тэрыторыя Перамогі"**, які абядноўвае 250 музеяў і ваенна-гістарычных цэнтраў Расіі і замежных краін.
• Віртуальны музейны альбом **"Як нашы дзяды ваявалі"**.
• Анлайн-выстава **"Пінская рачная ваенная флатылія"**.
• Інтэрактыўная праграма **"Усё вышэй, вышэй і вышэй..."** на пляцоўцы ля самалёта Лі-2 – аб героях вайны і лётных подзвігах, а таксама цікавыя факты з гісторыі ваенна-транспартнага самалёта Лі-2. **Кожную суботу і нядзелю з мая па верасень.**
• Майстар-класы ў "Музеі для дзяцей" – **пластылінавы жывапіс і малюнак у тэхніцы гратаж (серада – нядзеля з 10:00 да 17:00).**

УНП 100235472

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8-01596) 2 82 90, (8-01596) 2 82 70

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Выстава **"Пакт Рэрыха — Мір праз Культуру"**. Слановая зала. **Да 30 жніўня.**
• **Выстава "Белая зброя краін свету"**. 1-шы адсек Паўночнага корпуса. **Да 25 снежня.**
• Фотадакументальная выстава **"Без тэрміну даўнасці"**, прымеркаваная да Года гістарычнай памяці і прысвечаная генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Сямейная квэст-экскурсія **"Легенды і паданні Мірскага замка"** (група ад 2 да 5 чалавек).
• Экскурсія для дваіх **"Інтрыгі Купідона"**.
• Экскурсія **"Падарожжа ў часе"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **"Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце"; "Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст."; "Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст."; "Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў"**.

УНП 590201541

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: +375 17 363 77 96, +375 17 358 88 78

• **Пастаянная экспазіцыя**.

УНП 100377771

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: +375177020602, 20660, +375295518051, +375291903149

Палацавы ансамбль:
• Міжнародны выставачны праект **"Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара". У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Часовая экспазіцыя **"GLORIA ARME: ваенна-гістарычная рэканструкцыя даспехаў і зброі"**. Вялікая выставачная зала. **Да 23 кастрычніка.**
• Выставачны праект, прысвечаны Году гістарычнай памяці, **"Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны". Да 15 студзеня 2023 г.** У экспазіцыйнай зале першага пускавога комплексу.
• Выстава-атракцыён па матывах творчасці мастака і рэжысёра Алы Мацюшэўскай **"Час – хуткая рака"** – да Года гістарычнай памяці. Гульня-блукалка "Вандроўка ў свет анімацыі" (па матывах выставы-атракцыёна). **Да 9 кастрычніка.**

Мерапрыемствы:
• **Квэсты:** "Палацавыя таямніцы"; "Музычная скарбніца Нясвіжскага палаца".
• **Віртуальныя выставы: "Нясвіж – здабытак сусветнай культуры".** Выстава Паўла Татарнікава **"Магнацкія двары і замкі Беларусі". "Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны".**
• **Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках г. Нясвіжа.**

Аддзел экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці (г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1):
• Выстава акварэлей Любові Абрамавай **"Таймлапс". Да 30 верасня.**

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3):
Пастаянныя экспазіцыі:
• **"Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII – 1-й палове XIX стст."**
• **"Нясвіж у міжваенны час. Людзі падзеі".**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стст. **"Культура часу"**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы:
• Экскурсія з элементамі гістарычнай гульні **"Музейныя вандроўкі"**.
• Квэсты: **"Карта сямі каралеўстваў"; "Сакрэты старога захавальніка".**
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **"Школа шпіёнаў"**. Да 25 чалавек.
• **"Дзень нараджэння ў Ратушы"**. Група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў.
• **"Дзень нараджэння з клаўнесай Карамелькай/лялькай Лолі)"**. Група ад 4 да 10 чалавек ад 4 да 12 гадоў.

Архітэктурны помнік "Слуцкая брама":
• Часовая экспазіцыя **"Храмавае дойлідства Нясвіжа". Да 30 верасня.**

Падрабязнасці па тэлефонах +3751770 20602, +3751770 20660 або на сайце niasvizh.by.

УНП 600207920

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спартакомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: +375 17 507 44 68

• **Пастаянная экспазіцыя**.
• Выстава **"Адзінства ў разнастайнасці"** – творчы праект мастакоўскай сям'і Курачыцкіх. Станковы жывапіс, пластыка з шамоту і керамікі, мармурнай крошкі і бронзы. **Да 20 кастрычніка.**

УНП 100377771

З пытаннямі размяшчэння рэкламы звяртайцеся па тэлефоне 8(017) 334 57 41.

Сустрэча Янкі і Якуба

6 жніўня ў мемарыяльнай сядзібе "Смольня" філіяла Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа "Мікалаеўшчына" прайшло літаратурна-музычнае свята да 110-годдзя першай сустрэчы народных паэтаў Беларусі Якуба Коласа і Янкі Купалы.

У музеі народных паэтаў была падрыхтаваная святочная праграма з удзелам паэтаў і пісьменнікаў, землякоў Якуба Коласа, членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі і прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі. Усе ахвочыя маглі паслухаць традыцыйныя песні і знакамітыя вершы ў выкананні народных калектываў. Галоўнай падзеяй свята стала тэатральная замалёўка "Сустрэча Янкі і Якуба" ў выкананні вядомых беларускіх акцёраў Ігара Пятрова і Сяргея Навіцкага.

Ульяна КАСЦЮНІНА

Фота прадастаўлена Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеем Якуба Коласа

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь

аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Тэлефоны: **(17) 397 01 63; (25) 667 78 19**

Яшчэ больш варыянтаў культурнага адпачынку можна знайсці ў нашым тэлеграм-канале **@kultinfa**

Каб падпісацца на газету "Культура", не абавязкова ісці на пошту!

КУЛЬТУРА

Пераможца 2006 г.
Гран-пры 2010 г.
Пераможца 2022 г.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
Дырэктар — ДУЛЕВІЧ Віктар Іванавіч.
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.

Галоўны рэдактар — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч;
Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна
Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ;
Рэдактар аддзела: Яўген РАГІН;
Аглядальнікі рэдакцыі: Надзея БУНЦЭВІЧ, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЕЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ, Данііл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.
Сайт: www.kimpress.by.
E-mail: kultura.bel@yandex.by.
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41.
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.
©"Культура", 2022.
Наклад 2955.
Індэксы 63875, 638752.
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Падпісана ў друк 12.08.2022 у 18:00. Замова №1919.
Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Беларускі Дом друку". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.